

**Вясёлыя гісторыі нашых чытачоў**
СТАР. 5



**Бізнес выратуе малую радзіму?**
МС



**«Бязвіз» штурхае кадры**
МС

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінскага аблвыканкама:**

*«Як вядома, 2018 год у Беларусі аб'яўлены Годам малой радзімы. Калі чалавек любіць сваю малую радзіму і хоча ўнесці ўклад у яе пераўтварэнне, гэта добра. Важна, каб усё рабілася ў рамках заканадаўства. Улады могуць дазволіць такія пачынанні і дапамогуць. Аднак няправільна маніпуляваць паняццем малой радзімы ў асабістых мэтах».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 4° |
| Віцебск | + 2° |
| Гомель | + 1° |
| Гродна | + 4° |
| Магілёў | + 1° |
| Мінск | + 2° |

ISSN 1990 - 763X

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

№ 56 (28672)

23 САКАВІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА

# ДРУЖБА ЯК ДОБРАЯ АСНОВА

**Учора ў Тбілісі адбылася сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Грузіі Георгіем Маргвелашвілі, па выніках якой быў падпісаны стратэгічны дакумент аб супрацоўніцтве дзвюх краін.**

На перагаворах з грузінскім калегам Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў асаблівую дружбу паміж народамі Беларусі і Грузіі і добрыя пачуцці, якія засталіся яшчэ з савецкага часу. «Я сапраўды сюды еду як дадому. Хоць і другі раз. Але я адчуваю, што тут блізкія нам людзі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Перагаворы кіраўнікоў дзяржаў спачатку прайшлі ў фармаце сам-насам, а затым у пашыраным складзе. Прэзідэнты разгледзелі шырокае кола пытанняў парадку дня двухбаковага супрацоўніцтва з акцэнтам на развіццё ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай сферы, а таксама ўдзялілі ўвагу кантактам у сферы палітыкі, абмеркавалі сітуацыю ў свеце і рэгіёне.

СТАР. 2


Фота БЕЛТА.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# МАЙСТАР-КЛАС АД НАРОДНАГА МАЙСТРА

**Умелец з Гарадка Васіль СІМАНОВІЧ *(на фота справа)* адзін з першых у краіне асвоіў забытае рамяство спіральнага пляцення. Не толькі сам вырабляе прыгожыя кубельчыкі і кузубы, сявенькі *(па-гарадоцку — севалкі)* і кошыкі, але і перадае свае навыкі іншым. Працуючы ў раённым Доме рамёстваў і фальклору, Васіль дае майстар-класы для дзяцей, інвалідаў, пенсіянераў. На гэтым здымку пабач з умельцам працуюць пенсіянеркі — Людміла КРАСІКАВА, Аліна ЛУШЧЫК і Ларыса ГАЛУЗА, якія і самі сталі ўжо хвацкімі спецыялістамі.**

■ На край свету

# У АФРЫКУ — НА «ЖЫГУЛЯХ»

## Як беларусы прынялі ўдзел у дабрачынным ралі

**Ралі Dakar Challenge праходзіць штогод. Задача: дабрацца з іспанскага горада Тарыфа да сталіцы Гамбіі — Банджула. Пры гэтым адна з умоў удзелу ў тым, што аўтамабіль, на якім будзе ехаць экіпаж, павінен каштаваць не больш за 500 фунтаў, у пераводзе на беларускія грошы гэта нават менш за 1400 рублёў. У канцы заезду ўсе машыны прадаюць з аўкцыёну, а грошы аддаюць на дабрачыннасць. Сёлета ў ралі ўпершыню вырашыла прыняць удзел каманда з Беларусі, але ў дарозе ўсё пайшло не па плане...**

### «Усюдыход» за смешную суму

Трое сяброў Мікіта, Яўген і Вераніка практычна да вар'яцтва ўлюбёныя ў падарожжа, прычым у прамым сэнсе. Нярэдка ім у галаву прыходзяць даволі экстрэмальныя ідэі. Вяртаючыся разам з Ірана, яны паўжартам пачалі абмяркоўваць і гэта ралі, пра якое Мікіта даведаўся выпадкова. Ужо пасля думка ніяк не выходзіла з галавы ў кожнага, і яны вырашылі: трэба ехаць!

Самым складаным этапам падрыхтоўкі было знайсці, а галоўнае адрамантаваць прыдатную машыну. У гэтым ім дапамог знаёмы хлопец Міша з Маладзечна, якому на той момант было ўсяго шаснаццаць гадоў. Але гэта не перашкодзіла яму ператварыць «Жыгулі» за 170 долараў у цалкам сабе надзейны сродак перамяшчэння.

СТАР. 4


Сябры Жэня, Вераніка і Мікіта.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!
Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на II квартал 2018 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ДРУЖБА ЯК ДОБРАЯ АСНОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік беларускай дзяржавы пагадзіўся са словамі грузінскага лідара аб тым, што супрацоўніцтва дзвюх краін развіваецца ў першую чаргу дзеля грамадзян. Гэта датычыцца ўзаемадзеяння як у сферы паставак і вытворчасці прадуктаў харчавання, так і складанай тэхнікі. «У Беларусі няма закрытых тэм у супрацоўніцтве з Грузіяй», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён таксама выказаў упэўненасць, што краіны ўжо сёлета змогуць пераадолець адзнаку $200 млн ва ўзаемным гандлі.

Георгій Маргвелашвілі таксама выказаўся за развіццё адносін паміж Беларуссю і Грузіяй. «Гэты візіт азнаменаваны тым, што мы будзем падпісваць дагавор, які стане вызначаць адносіны паміж Беларуссю і Грузіяй на многія дзесяцігоддзі. Дзякуй вам асабіста за дружбу і добрае стаўленне», — сказаў Прэзідэнт Грузіі. Ён падкрэсліў, што адносіны дзвюх краін для многіх у свеце могуць быць прыкладам.

На перагаворах у пашыраным складзе лідар Беларусі падзякаваў кіраўніцтву Грузіі за падтрымку на міжнародных пляцоўках, у тым ліку ў АБСЕ, ААН, на пляцоўцы «Усходняга партнёрства»: «Не было таго выпадку, каб Грузія не стаяла побач з Беларуссю ў самыя складаныя часы».

Гаворачы аб развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што краіны ідуць не проста па шляху звычайнага тавараабмену, хоць гэта і важна, але пачынаюць ствараць навуковыя цэнтры для патрэб сельскай гаспадаркі, сумесныя вытворчасці. Прэзідэнт дадаў, што для эфектыўнага развіцця таго ці іншага кірунку неабходны падрыхтаваныя кадры, і ў гэтым плане ў краін ёсць добры патэнцыял для ўзаемадзеяння. «Калі мы ствараем сумесныя прадпрыемствы па трактарабудаванні, мы вам дапаможам падрыхтаваць спецыялістаў па гэтым кірунку, калі па жывёлагадоўлі — дапаможам вучонымі і спецыялістамі, калі мы вырашылі разам з вамі займацца транспланталогіяй — прыехаў наш кіраўнік цэнтра, прызнаны ва ўсім свеце», — канстатаваў Прэзідэнт Беларусі.

Па выніках перагавораў лідары дзвюх краін падпісалі Дагавор аб асновах супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Грузіяй. У дакуменце замацаваны намер Беларусі і Грузіі ўмацоўваць узаемадзеянне на ўсіх узроўнях і ва ўсіх сферах, што ўяўляюць узаемную цікавасць.

Адзначаецца таксама намер заахвочваць кантакты на ўзроўні малога і сярэдняга бізнесу і рэалізацыю сумесных праектаў, развіваць супрацоўніцтва ў галіне максімальна эфектыўнага выкарыстання транзітнага патэнцыялу бакоў шляхам рэалізацыі сумесных праектаў у галіне транспарту і лагістыкі, а таксама ўдзелу ў развіцці міжнародных транзітных калідораў. Акрамя таго, Беларусь і Грузія будуць спрыяць пашырэнню міжрэгіянальнага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння ў сферы турызму.

У прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў былі таксама падпісаны яшчэ 10 дакументаў, накіраваных на развіццё супрацоўніцтва па канкрэтных кірунках.

# Падваенне тавараабароту магчымае

## Пра гэта сведчыць узаемны інтарэс дзелавых колаў дзвюх краін

**Грузінска-беларускі бізнес-форум у Тбілісі сабраў каля 300 дэлегатаў. У выніку перагавораў прадстаўнікоў беларускіх і грузінскіх кампаній учора было афармлена амаль тры дзясяткі дамоўленасцяў на суму каля $9 млн.**

«Сума не такая вялікая, — пракаментаваў лічбу журналістам старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч, — але гэта толькі пачатак. Важна, што мы пачалі рэалізоўваць сумесныя праекты, у тым ліку ў галіне машынабудавання».

У прыватнасці, аб адкрыцці зборачнай вытворчасці беларускіх трактароў у Батумі паведаміў генеральны дырэктар ААТ «МТЗ» Фёдар Дамаценка. Адзін з ключавых дагавораў падпісаны паміж «Магілёўліфтмашам» і ТАА «ГТУ-СІС». Кантракт на пастаўку 20 самазвалаў на суму больш як $1 млн заключыў Мінскі аўтамабільны завод.

БелАЗ падпісаў пагадненне аб продажы кар'ернай тэхнікі горназдабыўной кампаніі RMG Copper. «Бабруйскаграмаш» дамовіўся з грузінскім пастаўшчыком сельскагаспадарчай тэхнікі ТАА «Гермес» аб арганізацыі ў Грузіі пастаянна дзеючай выставы ўласнай прадукцыі.

Пра вытворчасць беларускіх электробусаў у Тбілісі вёў перамовы генеральны дырэктар «Белкамунмаша» Уладзімір Кароль. Беларускі нафтавы гандлёвы дом дамовіўся з прадстаўніцтвам прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтахім» у Грузіі на дадатковую пастаўку прадукцыі «Белшыны». З гэтай жа кампаніяй падпісалі дакументы аб пастаўках прадукцыі і супрацоўніцтве Гомельскі хімічны завод і ААТ «Нафтан».

Стане больш у Грузіі і прадуктаў харчавання з Беларусі. Адпаведнае пагадненне на бізнес-форуме заключыў Калінкавіцкі малочны камбінат. Шэрагу дамоўленасцяў з грузінскімі кампаніямі дасягнулі беларускія прадпрыемствы фармацэўтычнай галіны.

Беларускае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» заключыла мемарандум аб супрацоўніцтве з кампаніяй Partnership Fund — найбуйнейшым дзяржаўным інвестыцыйным фондам Грузіі. Акрамя таго, кантракты на пастаўку прадукцыі заключылі ААТ «Экзон». У рамках секцыі «Сучасны Мінск і Тбілісі» падпісаны мемарандум паміж СААТ «Камунарка» і ТАА «Бел Трэйд» і пагадненне паміж інфармацыйна-турыстычным цэнтрам «Мінск» і LLC Resistorgeo.

**Паводле БЕЛТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### СМІ: МЭЙ МАЕ НАМЕР ПЕРАКАНАЦЬ ЕС ВЫСЛАЦЬ РАСІЙСКІХ ДЫПЛАМАТАЎ

Вялікабрытанія паведамляе разведвальныя даныя па «справе Скрыпаля» ключавым саюзнікам з мэтай пераканаць іх выслаць расійскіх дыпламатаў з астатніх еўрапейскіх краін. Пра гэта інфармуе Bloomberg са спасылкай на крыніцы, знаёмыя з сітуацыяй. Тэрэза Мэй падчас абеду з іншымі лідарамі на саміце ЕС у Брусэлі ў чацвер «будзе папярэджваць аб пагрозе, якую нясе Расія з урадам Уладзіміра Пуціна ўсёй Еўропе», сказаў журналістам высокапастаўлены брытанскі чыноўнік. Улады Вялікабрытаніі лічаць Расію датычнай да атручвання былога супрацоўніка ГРУ, які працаваў на брытанскую разведку, Сяргея Скрыпаля і яго дачкі Юліі.

### ТРАМП АДКАЗАЎ КРЫТЫКАМ

«Я патэлефанаваў прэзідэнту Расіі Пуціну, каб павіншаваць яго з перамогай на выбарах (раней Абама таксама яму званіў). Фэйкавыя медыя звар'яцелі, таму што хацелі, каб я яго крытыкаваў. Яны не маюць рацыі! Жыць у згодзе з Расіяй, мець з ёй стасункі — гэта добра, а не дрэнна», — напісаў Трамп на сваёй старонцы ў Twitter. «Яны могуць дапамагчы вырашыць праблемы з Паўночнай Карэяй, Сірыяй, Украінай, Іранам і нават з будучай гонкай узбраенняў. Буш спрабаваў жыць у згодзе, але яму не хапіла «мазгоў». Абама і Клінтан спрабавалі, але ў іх не было энергіі або хіміі (успомніце «перазагрузку»). Мір праз дэманстрацыю сілы!» — сказаў ён на заканчэнне Трамп. У мінулы аўторак, 20 сакавіка, Трамп патэлефанаваў Пуціну, каб павіншаваць яго з перамогай на выбарах прэзідэнта Расіі, якія адбыліся 18 сакавіка. Газета The Washington Post пазней напісала, што дарадцы Трампа прапаноўвалі яму не віншаваць Пуціна з гэтай перамогай. Аднак Трамп іх не паслухаўся. Тэлефонная размова Пуціна і Трампа адбылася па ініцыятыве амерыканскага боку, удакладніла прэс-служба Крамля. У ходзе яе прагучала не толькі віншаванне з перамогай на выбарах. Лідары дзвюх краін абмеркавалі і шэраг іншых тэм, уключаючы сітуацыю ва Украіне, Сірыі і КНДР.



### КАМІТЭТ РАДЫ ПАДТРЫМАЎ АРЫШТ САЎЧАНКІ

Рэгламентны камітэт Вярхоўнай рады Украіны адобрыў прыцягненне да крымінальнай адказнасці, затрыманне і арышт дэпутата Надзеі Саўчанкі. Пра гэта паведамляе агенцтва УНІАН. Такім чынам, члены камітэта прызналі законным прадстаўленне генеральнага пракурора Юрыя Луцэнкі ў адносінах да Саўчанкі. Рашэнне было прынята аднагалосна. Раней генпракурор заяўляў, што Саўчанка планавала тэракт у Вярхоўнай радзе з выкарыстаннем стралковай зброі і гранат. Луцэнка адзначыў, што ў следства ёсць «неабвержныя доказы» таго, што Саўчанка асабіста арганізоўвала атаку і прыцягвала людзей для тэракта. Саўчанку ўжо выключылі з камітэта Рады па абароне і прапанавалі пазбавіць яе зоркі «Героя Украіны». У сваю чаргу дэпутат падала ў Вярхоўны суд Украіны іск з патрабаваннем прызнаць незаконным рашэнне аб яе выключэнні з камітэта.

## З першых вуснаў

# «АЦЭНКА ВЕДАЎ ПАВІННА БЫЦЬ ЗРАЗУМЕЛАЯ ЛЮБОМУ ВЫПУСКНІКУ»

**Новая рэдакцыя Кодэкса аб адукацыі ўнесена ва ўрад для папярэдняга разгляду. Пра гэта паведаміў міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.**

Як запэўніў міністр, пытанне вяртання да 12-гадовага навучання ў школе пакуль не разглядаецца. «Мы збалансавалі праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і па змесце, і па колькасці гадзін.Так, яшчэ ёсць асобныя перакосы. На жаль, ёсць настаўнікі, якія лічаць, што чым больш яны зададуць па сваім прадмеце, тым лепш. У выніку мы губляем якасць і абцяжарваем школьніка, — падкрэсліў ён. — Акрамя таго, маніторынг раскладу заняткаў у школах паказвае, што не заўсёды кіраўніцтва навучальных устаноў адказна ставіцца да іх складання. Першым урокам можа стаяць прадмет, па якім запланавана кантрольная работа, не заўсёды больш складаныя прадметы чаргуюцца з менш складанымі і гэтак далей... Карыстаючыся выпадкам, заклікаю кіраўнікоў сістэмы адукацыі ўзяць пад асабісты кантроль пытанні нагрузкі на вучняў у плане дамашніх заданняў. Гэта мая прынцыповая пазіцыя і як міністра, і як педагога».

Адказваючы на пытанні наконт далейшага функцыянавання гімназій, Ігар Карпенка паведаміў, што і ў гімназіях, і ў сярэдніх школах выкарыстоўваюцца аднолькавыя навучальныя праграмы па ўсіх вучэбных прадметах. А ў старшых класах і ў гімназіях, і ў школах прадугледжана магчымасць вывучаць прадметы на базавым і павышаным узроўнях. Адметнасцю навучальнага плана гімназій з'яўляецца толькі большая колькасць гадзін на вывучэнне замежнай мовы (плюс дзве гадзіны) у 5—9 класах. Але ніхто не збіраецца выключаць гэтыя дзве дадатковыя гадзіны з навучальнага плана гімназій.

— Больш за тое, для стварэння роўных умоў для ўсіх навучэнцаў плануецца і сярэднім школам таксама даць магчымасць адводзіць пяць гадзін замест трох на вывучэнне замежнай мовы ў 5—7 класах. Акрамя гэтага, мы пашыраем магчымасці выкарыстання гэтых пяці гадзін для школ і гімназій: з 8 класа яны могуць выкарыстоўвацца не толькі пад замежную мову, але і для вывучэння іншых вучэбных прадметаў на павышаным узроўні, — праінфармаваў міністр.

Закранаючы перспектывы ўкаранення незалежнай выніковай атэстацыі пасля базавай школы, Ігар Карпенка паведаміў, што цяпер разглядаецца аналаг рэспубліканскіх кантрольных работ, якія былі праведзены ў сакавіку гэтага года па матэматыцы і геаграфіі. Навучэнцы выконвалі іх у сваіх установах адукацыі па тэкстах Міністэрства адукацыі, а праверку ажыццяўлялі незалежныя камісіі на раённым і абласным узроўнях і ў Мінску. «Зараз мы аналізуем вынікі выканання вучнямі кантрольных работ, плюсы і мінусы механізма іх правядзення. Атрыманыя высновы будуць улічаны пры арганізацыі і правядзенні незалежнай атэстацыі, — растлумачыў ён. — Мяркуецца, што незалежная атэстацыя па завяршэнні навучання ў 9 класе будзе ўведзена пасля поўнага пераходу на абноўлены тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі, які адбудзецца ў 2019/2020 навучальным годзе».

Таксама міністр адукацыі паведаміў і пра будучыя змяненні ў ацэньванні работ удзельнікаў ЦТ.

— Магчыма, мы пяройдзем да новай метадалогіі ацэнкі тэставых выпрабаванняў пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Сёння выкарыстоўваецца метадалогія рэйтынга. Многія навучэнцы школ, а ў будучыні абітурыенты, іх бацькі, а часам і самі настаўнікі, не разумеюць, як выпускнік, які мае 8 па матэматыцы і, па ідэі, павінен атрымаць 80 балаў (ці хоць бы 70—75 балаў) пры ўступных іспытах, па тэсце раптам атрымлівае 45 балаў. Узнікаюць пытанні. Рэйтынг выводзіцца спецыяльнай камп'ютарнай праграмай, гэта вельмі складаны механізм. З пункту гледжання рэйтынга, якраз гэтыя 45 балаў могуць адпавядаць ацэнцы выпускніка за курс агульнай сярэдняй школы, але людзям усё роўна незразумела. У свеце існуюць і іншыя метадыкі, — паведаміў кіраўнік адукацыйнага ведамства. — Мы іх уважліва вывучылі, у тым ліку ў нашых найбліжэйшых суседзяў. Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў распрацаваў новую метадалогію ацэньвання тэстаў. Сёлета на яе пакуль пераходзіць не будзем, будзем ацэньваць па дзеючай методыцы, але паралельна ў рэжыме эксперымента ацэнім і па новай. Паглядзім, наколькі яна паспяховая ў рамках канкрэтнай уступнай кампаніі.

Міністр адукацыі таксама паведаміў, што ўжо фактычна завершана распрацоўка праекта Указа Прэзідэнта аб зацвярджэнні Правілаў прыёму ў новай рэдакцыі. Хутчэй за ўсё, большасць навацый, што плануюцца, закрануць уступную кампанію 2019 года.

Напрыклад, для абітурыентаў, якія паступаюць у ВНУ на спецыяльнасці, што патрабуюць наяўнасці адмысловых практычных навыкаў, можа быць уведзена дадатковае ўступнае выпрабаванне.

На шэрагу спецыяльнасцяў можа з'явіцца так званая папярэдняя прафесійна-псіхалагічная гутарка. Пералік такіх спецыяльнасцяў будзе ўстанаўлівацца адпаведнай пастановай і вядомы загадзя.

«Але абітурыентам гэтага года хвалявацца не трэба, — запэўніў Ігар Карпенка. — Праграмы ўступных выпрабаванняў ёсць, патрабаванні прапісаны, а лічбы прыёму мы да 1 красавіка абнародуем».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Памяць

# КАЛІ БОЛЬ АБ'ЯДНОЎВАЕ

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА пасля мітынгу-рэквіема ў мемарыяльным комплексе «Хатынь» адзначыла, што гэта трагедыя назаўжды застанецца ў сэрцах і памяці беларусаў. «Мы павінны шанаваць тое, што маем: мір, спакой, магчымасць працаваць, вучыцца, рэалізоўваць свае планы і задумы. А хатынская трагедыя назаўжды застанецца ў нашых сэрцах, у нашай памяці, — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Мы павінны і абавязаны перадаць гэта наступным пакаленням, каб ніколі тое, што адбылося шмат гадоў таму на нашай зямлі, не здарылася зноў. Гэтага дапусціць мы не маем права».**



Фота БЕЛТА.

Наталля Качанава адзначыла, што ў краіне праводзіцца палітыка міралюбнасці і сяброўства. Яна расказала, што не раз бывала ў Хатыні і перакананая, што беларусам трэба часцей прывозіць сюды дзяцей і ўнукаў, расказваць ім пра гэту трагедыю.

Тым часам па дыпламатычных каналах на адрас Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і ўрада краіны паступілі звароты з усяго свету ад грамадскіх дзеячаў і арганізацый, палітычных партый, аб'яднанняў беларускай дыяспары. Лісты прыйшлі з Венгрыі, Германіі, ЗША, Кыргызстана, Польшчы, Славакіі, Таджыкістана, Чэхіі... Пасланні накіравалі і генеральны сакратар АДКБ Юрый Хачатураў, і старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі Сяргей Кандыбовіч. Шмат хто не застаўся абыякавы да гэтай трагедыі. У пісьмах адзначаецца подзвіг беларускага народа ў той няпросты час, а таксама тое, што нават хатынская трагедыя не спужала і не зламала дух процістаяння ворагу.

Некаторыя аўтары лістоў, як спадар Пол Мур II, генеральны дырэктар арганізацыі CitiHope Relief and Development (ЗША), успамінаюць свае ўражанні, якія атрымалі, наведаўшы Хатынь: «У 1990 годзе ва ўзросце 17 гадоў мне ўпершыню выпаў гонар наведаць Хатынскі мемарыяльны комплекс у халодны, дажджлівы дзень — і гэты візіт назаўсёды змяніў маё жыццё. На жаль, калі я быў дзіцем, мне ніколі не расказвалі пра ахвяры і страты, якія не мелі сабе роўных і якія панёс народ Беларусі, каб абараніць увесь свет ад агіднай фашысцкай агрэсіі. Бой званоў, які чуецца з комінаў кожнага дома ў вёсцы, дагэтуль гучыць у маёй галаве кожны раз, калі я думаю пра 209 знішчаных гарадоў, пра 9200 спаленых вёсак і пра 2,5 мільёна беларусаў, якія былі пазбаўлены жыцця ў час вайны»...

**Надзея АНІСОВІЧ**

■

## БЕЗ БЮРАКРАТЫЗМУ І ТОЛЬКІ ПА СПРАВАХ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца ў суботу, 24 сакавіка, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах. Улады будуць адказваць на пытанні жыхароў краіны з 9.00 да 12.00.**

Старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Віктар Віталевіч АСКЕРКА. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблсавета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЯНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

старшыня МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Уладзімір Віктаравіч ДАМАНЕЎСКІ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Віктар Іванавіч СІРЭНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Надвор'е

# Удзень ужо з плюсам

### У нядзелю сіноптыкі чакаюць ад плюс 2 да плюс 9 градусаў

**У канцы тыдня ў краіне крыху пацяплее, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе ў асноўным вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, па паўночнай палове краіны адаб'ецца ўплыў малаактыўнага франтальнага падзелу. Таму чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, пераважна па паўночнай палове краіны пройдзе невялікі снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ў другой палове дня будзе ад нуля да плюс 6 градусаў.

Эксперты паведамляюць, што ў выхадныя надвор'е ў асноўным будзе вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца цалкам камфортнае надвор'е, і хоць па начах яшчэ будзе падмарожваць, у дзённыя гадзіны паветра пачне паступова праграваецца. Цудоўнае веснавое надвор'е прыйдзе да нас у суботу. У гэты дзень будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай на асобных участках дарог — галалёдзіца. Аднак уначы прагназуецца ад 2 да 8 марозу, у асобных раёнах па ўсходзе да мінус 9 — мінус 13 градусаў. Удзень будзе ад нуля па ўсходзе да плюс 7 градусаў па захадзе краіны.

Прагназуецца таксама без ападкаў і ў нядзелю. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 — мінус 9 градусаў, у асобных раёнах па паўднёвым усходзе краіны — 10—12 марозу. Удзень будзе ад плюс 2 градусаў па ўсходзе і да 9 цяпла па захадзе краіны.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак захаваецца ўплыў зоны павышанага атмасфернага ціску і будзе без дажджоў. Толькі па паўночным захадзе надвор'е абумовяць атмасферныя франты, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. А збольшага будзе пераважна без ападкаў, толькі днём па паўночным захадзе краіны чакаецца кароткачасовы дождж. Месцамі туман, слабы галалёд, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў. Удзень істотна пацяплее — ад плюс 4 градусаў да 11 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# ДЛЯ АДНАЎЛЕННЯ ЎНІКАЛЬНАГА АБ'ЕКТА...

### На тэрыторыі палаца ў Шчорсах наводзяць парадак

**Гэтымі днямі на тэрыторыі палаца Храптовічаў у Шчорсах, што пад Навагрудкам, праходзіць суботнік. Яго мэта — добраўпарадкаваць тэрыторыю гэтага помніка палацава-паркавай архітэктуры другой паловы XVIII стагоддзя.**



Будынак бібліятэкі.

Удзел у навядзенні парадку ў такім знакавым месцы прымаюць супрацоўнікі Навагрудскага райвыканкама, навучэнцы і педагогі Шчорсаўскага дзіцячага сада — сярэдняй школы, спецыялісты гаспадаркі «Шчорсы» і Шчорсаўскага сельвыканкама, а таксама жыхары саміх Шчорсаў. «Былы палац Шчорсаў — адно з папулярных турыстычных месцаў Навагрудскага раёна. Захаванню ўнікальнага помніка ўдзяляецца вялікая ўвага. І цяпершні суботнік — толькі першае з многіх мерапрыемстваў Года малой радзімы па навядзенні парадку тут. Ладзім яго з шырокім прыцягненнем грамадскасці. Магчыма, гэта натхніць кагосьці ў больш шырокім фармаце паўдзельнічаць у захаванні і аднаўленні ўнікальнага аб'екта», — адзначаюць у аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама.

Палацава-паркавы ансамбль у маёнтку Шчорсы быў пабудаваны па задуме апошняга канцлера Вялікага Княства Літоўскага графа Іахіма Храптовіча ў канцы XVIII стагоддзя. Увасаблялі задуму найлепшыя еўрапейскія майстры. Вядомыя Шчорсы не толькі палацам, унікальным паркам і сістэмай штучных вадаёмаў, але і бібліятэкай, дзе захоўвалася больш за 20 тысяч кніг, унікальных дакументаў і геаграфічных картаў. Тут на дзясяткі гадоў раней, чым на дзяржаўным узроўні, графам было адменена прыгоннае права. У часы Першай сусветнай вайны палац згарэў і ўжо не быў адноўлены. Захаваліся толькі фрагменты сядзібы, бетонныя слупы нізу агароджы, сутарэнні палаца, будынак бібліятэкі і некалькіх іншых пабудоў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■

■ Справы духоўныя

# ВОСЕННЮ ЧАКАЕМ ПАТРЫЯРХА

**Пасяджэнне Святога Сінода Рускай праваслаўнай царквы плануецца правесці ў кастрычніку ў Беларусі, паведаміў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

«Чакаецца прыезд Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, пастаянных і часовых членаў Святога Сінода РПЦ 13 кастрычніка гэтага года напярэдадні свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Пакуль яшчэ план не зацверджаны. Ёсць толькі папярэднія наметкі», — адзначыў мітрапаліт Павел. Ён удакладніў, што пасяджэнне Святога Сінода, магчыма, будзе праведзена 15 кастрычніка.

«Будзем спадзявацца, што час ад часу ў будучыні Святы Сінод будзе праводзіцца на тэрыторыі Беларусі», — сказаў Уладыка. Паводле слоў мітрапаліта, яшчэ летась у размове з кіраўніком дзяржавы ішла гаворка аб магчымым прыездзе Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. Прэзідэнт тады адказаў, што ў Беларусі гэты чалавек заўсёды жаданы госць.

Акрамя таго, 2018 год у Беларускай праваслаўнай царкве абвешчаны Годам мітрапаліта Іосіфа (Сямашкі). У сувязі з гэтым у Беларускім экзархаце створаны камітэт, які займаецца арганізацыяй мерапрыемстваў, прымеркаваных да святкавання 220-годдзя з дня нараджэння і 150-годдзя са дня смерці мітрапаліта. У прыватнасці, ідзе работа па стварэнні дакументальнага фільма, выданні кніг.

Што датычыцца пытання прылічэння мітрапаліта Літоўскага і Віленскага Іосіфа (Сямашкі) да ліку святых, казаць пра гэта заўчасна, адзначыў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел. Зараз вядзецца работа па зборы матэрыялаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю гэтага чалавека, але прымаць такое рашэнне будзе вышэйстаячая камісія па кананізацыі святых, паведаміў іерарх.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■

# РЫБАЛОЎСТВА ДАЗВОЛЕНА, АЛЕ АБМЕЖАВАНА

**У Брэсцкай і Гомельскай абласцях з 20 сакавіка ўводзіцца забарона на лоўлю ўсіх відаў рыбы.**

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, працягнецца яна да 18 мая. У Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях такая забарона пачынае дзейнічаць з 1 красавіка і працягнецца да 30 мая, у Віцебскай вобласці — з 10 красавіка да 8 чэрвеня.

Падчас нераставай забароны аматарскае рыбалоўства цалкам не забаронена, але істотна абмежавана: рыбачыць можна толькі адной вудай з адным кручком або адным спінінгам, аснашчаным штучнай прынадай з адным адзінарным або двайным ці трайным кручком у светлы час сутак з берага (без заходу ў ваду) альбо з лёду, са штучных збудаванняў.

За выкарыстанне любых іншых прылад або спосабаў лоўлі ў перыяд забароны на парушальніка можа быць накладзены штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь. За вылаўленую забароненым спосабам або прыладай рыбу парушальнік абавязаны пакрыць шкоду, якая ў перыяд нераставай забароны вылічаецца па трайных таксах. Прычыненне шкоды на суму 100 і больш базавых велічынь з'яўляецца падставай для распачынання крымінальнай справы. На працягу ўсяго перыяду забараняецца карыстацца маламернымі суднамі — не толькі для рыбалоўства, але і для іншых мэт.

Тэрміны агульнай веснавой нераставай забароны перасякаюцца з лакальнымі забаронамі, установленымі асобна на некаторыя віды рыб — шчупака, судака, сома. Такую рыбу, злоўленую ў перыяд дзеяння лакальнай забароны, неабходна адпусціць назад у вадаём.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «ЗВЯЗДА» ЗАЦІКАВІЛА ШКОЛЬНІКАЎ

## Упершыню фестываль пошты і друкаваных СМІ прайшоў у сценах установы адукацыі

**У Гродне сталі традыцыйнымі фестывалі, якія ладзяцца Гродзенскім філіялам «Белпошты» і друкаванымі выданнямі. Чарговая сустрэча з падпісчыкамі адбылася ў самай «населенай» школе горада, дзе вучацца больш за тры тысячы школьнікаў. Многія з іх зацікавіліся выданнямі «Звязды». Для сустрэчы з гродзенцамі Выдавецкі дом «Звязда» падрыхтаваў не толькі экзэмпляры сваіх выданняў, але і нямала добрых бонусаў.**

Да «звяздоўскага» стэнда падчас перапынку раз-пораз падбягалі школьнікі, і ніхто не адыходзіў з пустымі рукамі. Для кожнага знаходзіўся прыгожы насценны каляндар, флажок ці часопіс у падарунак. Для падпісчыкаў — больш сур'ёзныя прызы. Кубкі, бейсболкі, майкі, штодзённікі і нататнікі з логатыпам выдання. Выбар падпіскі вялікі, бо, як вядома, Выдавецкі дом аб'ядноўвае каля дзесяці выданняў. У іх ліку газеты — «Звязда», «ЛіМ», часопісы — «Маладосць», «Алеся», «Вожык», «Родная прырода» і іншыя. Усе яны былі выстаўлены на стэндах. Юных падпісчыкаў зацікавіў часопіс для дзяцей



«Бярозка». Пяцікласнік Яўген прыйшоў са сваімі сябрамі, каб пазнаёміцца са зместам выдання. Вядома ж, атрымаў падарунак. Настаўнікі і бацькі, якія прыйшлі па дзяцей у школу, гарталі газету «Звязда». Тут жа можна было і аформіць падпіску.

— Для рэдакцый гэта добры шанц пазнаёміць са сваім выданнем, а для падпісчыкаў яшчэ і атрымаць падарунак, — зазначыла **начальнік аб'яднанага цэха паштовай сувязі Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Святлана ГРЫБ.** — Гродзенцы пачынаюць прывыкаць да такіх мерапрыемстваў, хоць гэта і новая форма: мы пачалі практыкаваць яе ў мінулым годзе. Папярэднія фестывалі праходзілі на адкрытых пляцоўках ў цэнтры горада. Зараз мы з-за нестабільнага надвор'я размясціліся ў школе, якая знаходзіцца ў новым мікраражне. Паступова будзем даходзіць і да іншых куткоў горада. Наш філіял знаёміць наведвальнікаў з новымі паслугамі аддзяленняў сувязі, мы прапануем падпісаць віншавальную паштоўку прызёрам Алімпійскіх гульняў у Пхёнчхане, аформіць дабрачынную падпіску для дзяцей-сірот, набыць сувенірную прадукцыю, а таксама сертыфікат на любое выданне.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# У АФРЫКУ — НА «ЖЫГУЛЯХ»



Галоўны герой падарожжа — ВАЗ 2106.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Праўда за тыдзень да ад'езду панерваваліся ўсё ж такі прыйшлося. Мікіта, які ў паездцы выконваў ролю няззменнага кіроўцы, канчаткова даводзіў машыну да розуму і практычна кожны дзень паведамляў сябрам аб новых паломках. Калі, здавалася, усе перашкоды былі ліквідаваны, і каманда рушыла ў далёкі шлях, трыумф іх быў зусім нядоўгі. Выехаўшы з гаража, яны праехалі ўсяго 500 метраў і заглухлі. Гэта магло б спыніць менш упартых маладых людзей, але няўер'е большасці навакольных у поспех іх задумы, прымусіла сяброў шукаць выхад з сітуацыі. Машыну паправілі, і яна нават амаль дацягнула да месца збору ўсіх камандаў у Іспаніі, зламаўшыся ўсяго за сто кіламетраў ад мэты. Гэтым разам паломка была куды больш сур'ёзная — барахліў карбюратар. Як жартуе Мікіта, яму давялося медытаваць побач з машынай усю ноч, каб «дамовіцца».

Тым часам у Тарыфе сабраліся каля 30 экіпажаў. У асноўным усе выхадцы з Вялікабрытаніі. Многія ўжо на пенсіі і так бавяць вольны час. З рускамоўных былі толькі дзве каманды: наша і хлопцы з Украіны. Больш за ўсё нашых падарожнікаў здзівілі машыны. Практычна ўсе былі на пазадарожніках, якія на вуліцах Мінска яшчэ з дзясятак гадоў глядзеліся б цалкам прыстойна. Балазе, сярод мэт ралі няма такой, каб фінішаваць першымі. Дарэчы, і маршрут, па якім рухацца, кожны экіпаж выбірае самастойна, галоўнае — дабрацца да фінальнага пункта. Для сябе Мікіта, Жэня і Вераніка склалі такі план: Іспанія — Марока — Маўрытанія — Сенегал — Гамбія. Імкнуліся выбраць кароткую дарогу, каб хоць крыху паберагчы машыну.

### Нічыйная зямля, ці начлег на мосце

У першай краіне на Афрыканскім кантыненце сябры правялі каля тыдня. Пачалі з горада Фес, дзе здымаўся шчыра ўпадабаны на тэрыторыі Беларусі серыял «Клон». Праўда, самі вандроўнікі ўбачылі зусім іншую, не серыяльную карцінку: бруд, вельмі вузкія вулачкі-лабірынты і мясцовыя жыхары, якія ўвесь час спрабуюць атрымаць максімальную выгаду з прыезджых: для «белых» усё аўтаматычна становіцца ў разы даражэйшае.

На час ралі якраз выпаў Новы год, які сябры весела адзначылі ў кафэ ў Маракешы. Пасля гэтага яны збіраліся ў Агадзір на ўзбярэжжа, але нечакана памянялі ўсе планы і вырашылі ехаць у процілеглы бок. Так прыцягнуў іх горад Уарзазат, які можна было б назваць мараканскім Галівудам, бо там размешчана вядомая кінастудыя. Па дарозе туды знаходзіцца найпрыгажэйшы перавал. І беларускі экіпаж палюбаваўся краявідамі спаўна — кожныя некалькі кіламетраў прыходзілася спыняцца і чакаць, пакуль машына «адпачне».



У бербераў у Марока.

Па дарозе сябры вырашылі падабраць хлопца, які аказаўся берберам. Ён запрасіў іх да сябе дадому, у лагер качэўнікаў. Потым высветлілася, што гэта платная экскурсія, але падарожнікі ўсё роўна засталіся задаволеныя. Яны заначавалі ў пустыні, пакаштавалі мясцовую кухню і нават пакаталіся на вярблюдах. Далей шлях ляжаў у бок Маўрытаніі.

— На мяжы Маўрытаніі і Заходняй Сахары ёсць невялікае мінное поле. З першага погляду яно выглядае страшнавата: уздоўж дарогі раскіданыя некалькі падарваных машын. Але там прабіта добрая каляіна. Калі з яе не з'язджаць, усё павінна быць у парадку, — абсалютна спакойна ўспамінае Мікіта.

Далей беларускіх авантурыстаў чакала не менш уражальная карціна: ад мяжы да сталіцы — 400 кіламетраў, прычым на ўсім шляху сустракаецца толькі два населеныя пункты. І гэта зусім не мілыя вёсачкі, а з дзясятак напаўразбураных хлеўчыкаў, якія стаяць уздоўж дарогі. Каманда думала праскочыць Маўрытанію за два дні. Але дзе там... Ад Нуакшота, сталіцы краіны, да мяжы з Сенегалам усяго 200 кіламетраў, таму адлегласць экіпаж думаў пераадолець за пару гадзін. Але шлях ляжаў не па асфальце, а па пісце — выбітай у пустыні каляіне. Так што да мяжы яны дабраліся толькі пад вечар. З тэрыторыі Маўрытаніі выехалі без праблем, праўда, давялося заплаціць адзін еўра за ўздым шлагбаума — гэты збор вельмі рассмяшыў сяброў.

Але потым ім стала не да смеху. З адной краіны яны выехаць змаглі, а вось трапіць у іншую — не. З-за адсутнасці віз іх адправілі назад, паспрабаваць шчасця ў пасольстве Сенегала ў Нуакшоце. Але справа не ў бездакказнасці падарожнікаў, а ў тым, што атрымаць візу ў прынцыпе практычна нерэальна. У Беларусі няма Сінегальскага прадстаўніцтва, а ў Расіі, па словах сяброў, ні на лісты, ні на званкі не адказваюць. Але галоўная праблема была нават не ў гэтым. Пакуль Вераніка, Мікіта і Жэня спрабавалі дамовіцца з сенегальскімі мытнікамі, закрыўся прапускны пункт на маўрытанскай мяжы, і назад іх не пусцілі. У выніку прыйшлося заначаваць у машыне проста на мосце, які адносіўся да нейтральнай тэрыторыі.

### Сапраўдная ўсходняя гасціннасць

— Мы, напэўна, адзіныя беларусы ў свеце, у якіх ёсць дзве маўрытанскія візы за адзін тыдзень. Пра яе кошт я лепш памаўчу. Затое было вельмі прыемна, што ўсе паставіліся да нас уважліва, вельмі здзівіліся, што мы так «хутка» вярнуліся, — смяецца Жэня.

Стомленыя падарожнікі адправіліся наўпрост у пасольства Сенегала. Тут важна ўспомніць, што да гэтага з імі здарылася дзіўная гісторыя. На запраўцы ў Нуакшоце іх аблічыў работнік, ён не хацеў вяртаць грошы, пакуль не ўмяшаўся мясцовы жыхар, які гаварыў па-англійску. Мужчына пакінуў сваю візітоўку і сказаў: будуць праблемы — тэлефануйце. Вядома, тады ўсе былі ўпэўненыя, што больш ніколі з ім не ўбачацца...

У пасольстве Сенегала візіту замежнікаў таксама здзівіліся. Як высветлілася, каб атрымаць візу, трэба прайсці гутарку абавязкова на французскай мове, прычым прашэнне будзе разглядацца на працягу месяца. Гэта значыць — без шанцаў, асабліва ўлічваючы, што ніхто з сяброў французскай не валодаў. Ралі прыйшлося завяршыць датэрмінова: тэрыторыя Гамбіі з усіх бакоў акружаная Сенегалам, так што трапіць у яе на машыне па-іншаму нельга.

Дарэчы, новы сябар нашых падарожнікаў, якога звалі Сядзі, тут жа адгукнуўся на іх бяду. Але аказалася, што на гэтым прыгоды не скончыліся. Пры ўездзе ў Маўрытанію машыну ўпісваюць у пашпарт яе ўладальніка, каб ён не пакінуў яе на тэрыторыі краіны — там запасіцца вельмі шмат аўтасмецця. Паўтарыць шлях назад на машыне экіпаж быў зусім не гатовы, проста кінуць і нават падарыць машыну таксама. На шчасце, Сядзі праз знаёмых знайшоў магчымасць пакінуць усюдыісныя «Жыгулі» на ахоўнай стаянцы. «Цяпер у Маўрытаніі ёсць анклаў Беларусі, наша машынка», — жартуюць хлопцы.

Пасля ўсіх перыпетый да самалёта дадому заставаліся яшчэ суткі, якія новы знаёмы пастараўся напоўніць сапраўднай усходняй гасціннасцю. Ён запрасіў падарожнікаў дадому на абед, потым адвёз на акіян, паказаў рынак і кафэ нацыянальнай кухні. Напрыканцы душэўны маўрытанін сказаў, што зараз у яго гасцей заўсёды ёсць дом у Нуакшоце.

— Мы былі вельмі натхнёныя гэтай сітуацыяй. Атрымліваецца, што ўсё склалася найлепшым чынам. Мы маглі б праехаць краіну за пару дзён і зусім нічога не даведацца пра цудоўных людзей, якія тут жывуць. Наогул гэтая паездка на многае раскрыла вочы. Нам сапраўды цяжка было глядзець, як там жывуць людзі, але большасць з іх адчуваюць сябе цалкам камфортна, яны так прывыклі і не жадаюць нічога змяняць, — разважае Вераніка.



Флаг Мінска на беразе Атлантычнага акіяна.

— І не факт, што наша дапамога ім у прынцыпе патрэбна. Мы рабілі ўсё шчыра, ад сэрца, але гэта нікога не хвалявала. Цяпер у нас ёсць мара забраць нашу цягавітую машынку з Маўрытаніі, прывезці ў Беларусь і ўжо тут прадаць з аўкцыёну. А атрыманыя грошы перадаць на дабрачыннасць, каб дапамагчы нашым, беларускім дзецям. Пакуль гэта толькі ідэя на мяжы фантастыкі, але хто сказаў, што такія ідэі не спраўджваюцца? — усміхаецца Жэня.

**Дар'я КАСКО.**




## СУПРАЦЬ ЛОМА... ЁСЦЬ ПРЫЁМЫ

У каго найболей розных гісторый, дык гэта, відаць, у настаўнікаў.

Вось і я некалі пасля заканчэння педагагічнага інстытута ды службы ў войску апынуўся ў Пухавіцкай сярэдняй школе. Сам невысочанькі, худзенькі, але ж спецыяліст, з дыпломам, з жаданнем вучыць — масы... Гэта цяпер у вясковых школах дзяцей раз два і абліčыўся, а тады, у 60-я гады мінулага стагоддзя, у кожным класе па 30 вучняў было!

Мяне яны адразу «ахрысцілі» Малекулай, аднак прынялі добра. Быў толькі адзін хлопец — здаровы такі, амаль на дзве галавы вышэйшы, які аж са скуры вылузваўся, каб мяне прынізіць, зрабіць якое паскудства.

Плаціць яму той жа манетай мне, настаўніку, зусім не выпадала. Вось і стаў я шукаць нейкі падыход. Для пачатку, помню, трохі папалохаў яго, сказаў:

— Міша, перастань бузіць, а то пойдзеш да дырэктара.

(Ягo, трэба сказаць, усе ў школе баяліся). А Міша раптам:

— Ну і пайду... Што ён мне зробіць?

А раптам, думаю, і сапраўды — нічога? Тады ж на гэтага бэйбуса зусім управы не будзе. Значыць, трэба нешта рабіць самому? Але што?

План дзеяннняў падказала... гульня, бо дзяцей вучыў я толькі на ўроках, а пасля — разам з імі ішоў на школьны стадыён, мы гулялі ў футбол. З Мішам, дарэчы, у адной камандзе. Ён стаяў на варотах, прычым добра стаяў...

Быў яшчэ адзін моцны гулец — Слава, таксама нашмат вышэйшы, дужэйшы, каржакаваты. У яго бацькоў я здымаў пакойчык — быў за свайго, а таму неяк смела прапанаваў:

— Слухай, хлопча, заўтра ў нас футбол, а ў перапынку давай з табой падужаемся?

— Гэта навошта? — здзівіўся Слава.

— Ну трэба так: я праведу некалькі прыёмаў, а ты ўжо, калі ласка, застагні, завойкай — нібыта ад болю... Згода?

— Ну, калі вам гэта трэба...

І вось яно пачалося: спачатку — гульня, потым — перапынак.

— Васіль Мікітавіч, а пакажыце нам колькі прыёмчыкаў, — папрасіў Слава.

Я ў адказ:

— Калі ласка.

Сталі мы з ім у стойку (я і сапраўды малекула), але ж давай розныя прыёмы рабіць — адзін, другі... А трэцім на калена яго — і бразь на зямлю.

Слава недзе паддаваўся, недзе супраціўляўся, а ўрэшце прасіцца стаў:

— Ну, хопіць... Баліць жа... Пусціце...

Вучні глядзелі на ўсё, здаецца, не міргаючы. А ўжо Міша — той і наогул рот не закрываў!

Праз дзень ён падышоў да мяне, спытаўся:

— А дзе вы барацьбе вучыліся?

— Трохі ў інстытуце, — кажу, — трохі ў войску.

— Хутчэй бы і мне туды, — уздыхнуў хлапец.

Што цікава, пасля гэтага ён стаў маім першым памочнікам і найлепшым вучнем.

...На адным з семінараў я, памятаю, расказаў калегам гэту гісторыю. Адзін з іх заўважыў:

— Дык гэта ж непедагагічны прыём.

— Затое дзейсны, — прызналі іншыя.

**Васіль Пяшэвіч,**

*в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.*

## ЖЫВЕ КУЛІК, ДЗЕ ПРЫВЫК...

Калі мне хто-небудзь возьмецца даводзіць, што пры ранейшай, камуністычнай уладзе карупцыі не было, — не паверу. Яна, відаць, нібы той баршчэўнік: у адным месцы вынішчаць (і, здавалася б, з каранем!), а ён ужо ў новым падняўся. І, што цікава, гэта не насцярожвае, бо расліна — як расліна — прыгожая, магутная, а дакранешся — і мала не падасца...

Прыклад? Ды калі ласка. Некалі ці не ў кожным райцэнтры апроч раённых выканаўчых камітэтаў былі яшчэ і гарадскія. Меркавалася, што кіраўніцтва іх (вядома ж, партыйнае) вырашае сацыяльныя праблемы гараджан.

Не без таго — вырашала, але ж аўтарытэт мацавала яшчэ і тым, што менавіта яно размяркоўвала розны дэфіцыт: мэблю, машыны, дываны... І знешне ўсё там выглядала чынчынам: існавалі адпаведныя спісы, чэргі, а паралельна...

Хадзілі чуткі (і не без падстаў), што многія «атаварваюцца» ў абход, што для гэтага варта завесці блат альбо «пазалаціць ручку»: у нашым гарсавеце — дзвюм вабным жанчынам Мар'яне і Дар'і.

Шмат хто да іх звяртаўся. У Паўлавіча таксама вопыт быў.

Ён, як расказваў, тады ў райкам працаваць прыйшоў — маладым інструктарам. Ганарыўся тым, што партыя даверыла, стараўся апраўдаць, а тут...

Ажаніўся ён, у сям'і з'явілася малое. І ўсё б нічога, ды кватэра ў інструктара на першым паверсе, падлога халодная, голая, а дзіцяці б папоўзаць...

— Нам бы дыванок які ці палас... Хоць маленькі, — прасіла па вечарах жонка. — Людзі ж неяк дастаюць, стараюцца. Можа, і ты паспрабаваў бы?

— Я?! У абход чаргі? — абураўся Павел. — Не, нізавошта...

Адмаўляўся, карацей, але ж і дзіця шкадаваў! А таму неяк раз перасіліў сябе — пайшоў у гарсавет.

Убачыў у патрэбным аддзеле жанчын і ўзрадаваўся: падумаў, што яны ж самі матулі, значыць, зразумеюць яго патрэбу! Ды не тут тое было:

— Мы вам нічым не дапаможам, — адказала не тое Дар'я, не тое Мар'яна. — У нас з гэтым строга. Вось глядзіце — спісы, чарга. І ваша — яшчэ далёка. Трэба чакаць, іншага выйсця няма...

Чалавек паверыў. А потым з тымі ж маладзіцамі за адным сталом апынуўся — віно ім наліваў. Тыя ахвотна пілі ды яшчэ і смяяліся:

— Ды помнім мы вас. Вы наконт паласа прыходзілі — як ніхто: нам аж смешна было — з пустымі рукамі. А прынеслі б рублёў па сто, і ўсё атрымалі б: і дыван, і палас...

«Прасіцелю» б тады абурыцца, народны кантроль падключыць, «разварушыць» тое асінае гняздо. Пасаромеўся — хіба што калегам сказаў.

Тыя, відаць, зрабілі высновы. Ва ўсякім разе адзін, якога райкам не ўзабаве рэкамендаваў на пасаду старшыні, яшчэ да абрання падышоў да згаданых маладзіц і сумленна «папярэдзіў»:

— Вы, Дар'я, пры мне і дня працаваць не будзеце. А на вас, Мар'яна, яшчэ пагляджу. Можа і спрацуемся.

### Аудиторское заключение независимой аудиторской организации по бухгалтерской отчетности ОАО «Минскконтракт» за период с 1 января по 31 декабря 2017 г.
### Акционерам, Наблюдательному Совету и руководству ОАО «Минскконтракт»

**Мнение с оговоркой**

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности ОАО «Минскконтракт», состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 31 декабря 2017 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств, отчета об использовании целевого финансирования за год, закончившийся на указанную дату, примечаний к бухгалтерской отчетности, предусмотренных законодательством Республики Беларусь.

По нашему мнению, за исключением возможного влияния обстоятельства, изложенного в разделе «Основание для выражения мнения с оговоркой», прилагаемая бухгалтерская отчетность достоверно выражает, во всех существенных аспектах, финансовое положение ОАО «Минскконтракт» по состоянию на 31.12.2017 г., финансовые результаты ее деятельности и потоки денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Основания для выражения мнения с оговоркой**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 56-3 «Об аудиторской деятельности», национальными правилами аудиторской деятельности, действующими в Республике Беларусь. Наши обязанности, предусмотренные указанными стандартами, более подробно рассматриваются в разделе «Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности» настоящего заключения. Мы являемся независимыми по отношению к аудируемому лицу согласно требованиям законодательства и этическим требованиям, применимым к нашему аудиту, и выполнили наши обязанности в соответствии с этими требованиями профессиональной этики. Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими для нашего мнения с оговоркой.

Мы не присутствовали при проведении инвентаризации запасов, поскольку дата проведения инвентаризации не совпала с датой проведения нами аудита. Мы не смогли проверить количество запасов посредством проведения альтернативных аудиторских процедур. Остатки запасов оказывают влияние на финансовые результаты деятельности и движение денежных средств аудируемого лица за 2017 г.

**Ключевые вопросы аудита**

Мы определили, что иные ключевые вопросы аудита, о которых необходимо сообщить в нашем аудиторском заключении, отсутствуют.

**Прочая информация**

Руководство аудируемого лица несет ответственность за прочую информацию. Прочая информация включает информацию, содержащуюся в годовом отчете, но не включает бухгалтерскую отчетность аудируемого лица и наше аудиторское заключение по ней.

Наше мнение о достоверности бухгалтерской отчетности аудируемого лица не распространяется на прочую информацию.

В связи с проведением нами аудита бухгалтерской отчетности аудируемого лица наша обязанность заключается в ознакомлении с прочей информацией и рассмотрении при этом вопроса, имеются ли существенные противоречия между прочей информацией и проверенной бухгалтерской отчетностью или нашими знаниями, полученными в ходе аудита, и не содержит ли прочая информация иных возможных существенных искажений. Если в результате рассмотрения прочей информации мы приходим к выводу о том, что прочая информация содержит существенные искажения, мы обязаны сообщить об этом факте. Мы не выявили никаких фактов, которые необходимо отразить в нашем аудиторском заключении.

**Обязанности аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности**

Руководство аудируемого лица несет ответственность за подготовку и достоверное представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля аудируемого лица, необходимой для подготовки бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий.

При подготовке бухгалтерской отчетности руководство аудируемого лица несет ответственность за оценку способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно и уместности применения принципа непрерывности деятельности, а также за надлежащее раскрытие в бухгалтерской отчетности в соответствующих случаях сведений, относящихся к непрерывности деятельности, за исключением случаев, когда руководство намеревается ликвидировать аудируемое лицо, прекратить его деятельность или когда у него отсутствует какая-либо иная реальная альтернатива, кроме ликвидации или прекращения деятельности.

Лица, наделенные руководящими полномочиями, несут ответственность за осуществление надзора за процессом подготовки бухгалтерской отчетности аудируемого лица.

**Обязанности аудиторской организации по проведению аудита бухгалтерской отчетности**

Целью нашего аудита является получение разумной уверенности в том, что бухгалтерская отчетность в целом не содержит существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок, и выдача аудиторского заключения, включающего наше мнение. Разумная уверенность – это высокая степень уверенности, но не гарантия того, что по результатам аудита, проводящегося в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, позволяет выявить все имеющиеся существенные искажения, когда оно имеет место, будет выявлено во всех случаях. Искажения могут возникать в результате недобросовестных действий или ошибок и считаются существенными, если можно обоснованно ожидать, что, индивидуально или в совокупности, они повлияют на экономические решения пользователей бухгалтерской отчетности, принимаемые на ее основе.

В рамках аудита, проводимого в соответствии с национальными правилами аудиторской деятельности, мы применяем профессиональное суждение и сохраняем скептицизм на всех этапах планирования и проведения аудита. Кроме того, мы выполняем следующее:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения бухгалтерской отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оцененными рисками; получаем достаточные и надлежащие аудиторские доказательства для формирования нашего мнения. Риск обнаружения существенного искажения, возникшего в результате недобросовестных действий, выше риска необнаружения существенного искажения, связанного с ошибкой, поскольку недобросовестное действие может включать сговор, подлог или подделку документов, умышленные пропуски, представление недостоверных сведений или нарушение системы внутреннего контроля;
- получаем понимание элементов системы внутреннего контроля, имеющих отношение к аудиту, с целью разработки аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам, но не с целью выражения мнения об эффективности внутреннего контроля аудируемого лица;
- оцениваем надлежащий характер применяемой учетной политики и обоснованность бухгалтерских оценок и соответствующих раскрытий информации, подготовленных руководством;
- оцениваем правильность применения руководством принципов учета на основе допущения и непрерывности деятельности и, на основании полученных аудиторских доказательств, о наличии или отсутствии существенной неопределенности в отношении событий или условий, которые могут вызвать значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность на непрерывной основе. Если мы делаем вывод, что существенная неопределенность присутствует, мы должны привлечь внимание в нашем аудиторском заключении к соответствующим раскрытиям в финансовой отчетности, или, в случае если такие раскрытия не являются адекватными, мы должны модифицировать наше мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных за период, заканчивающийся датой нашего заключения. Однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем представления в целом, структуру и содержание бухгалтерской отчетности, включая раскрытия, а также оцениваем, отражены ли в бухгалтерской отчетности исходные операции и события таким образом, чтобы было достигнуто их достоверное представление;
- мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, отвечающими за корпоративное управление, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированном объеме и сроках аудита, а также о существенных замечаниях по результатам аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля, которые мы выявляем в процессе аудита.
- мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.

из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

**А. В. Немеровец,**
**директор ООО «АудитИнком»**
**г. Минск, Беларусь**

**«22» февраля 2018 г.**

**Сведения об аудируемом лице:**

Наименование: Открытое акционерное общество «МИНСККОНТРАКТ» (ОАО «Минскконтракт»»). Свидетельство о государственной регистрации № 0017991, выдано решением Минского горисполкома от 27.07.2000 г. № 854g внесением в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (ЕГР) за № 100251588. Местонахождение: 220088, г. Минск, ул. Смоленская, 25.

**Сведения об аудиторской организации:**

Наименование: Открытое акционерное общество «АУДИТИНКОМ» (ООО «АудитИнком»).

Свидетельство о государственной регистрации выдано решением Минского горисполкома от 26.04.2001 года № 505 с внесением в Единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (ЕГР) за № 101234126. Местонахождение: 220005, г. Минск, ул. Гикало, д. 1, к. 302.

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Тамат. Апосум. Індык. Сталяр. Арба. Этап. Вал. Гага. Слімак. Актэт. Нява. Качан. Вакса. Ага. Адам. Літр. Арэлі. **Па вертыкалі:** Медуза. Такса. Жолаб. Куля. Трыа. Лава. Руль. Рэшата. Густ. Гліна. Пава. Мяч. Канфеці. Кава. Карма. Агат. Кадр.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.05 | 19.29 | 12.24 |
| Віцебск — | 6.54 | 19.19 | 12.25 |
| Магілёў — | 6.55 | 19.19 | 12.24 |
| Гомель — | 6.52 | 19.15 | 12.23 |
| Гродна — | 7.21 | 19.44 | 12.23 |
| Брэст — | 7.22 | 19.44 | 12.22 |

## Месяц

*Маладзік 17 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр.* *Васілісы, Галіны, Настассі, Віктара, Дзяніса, Кандрата, Купрыяна, Леаніда, Серафіма.*
*К.* *Пелагеі, Феліксa.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 23 САКАВІКА

**У краіне**

**1707** год — дата нараджэння Ігната Кульчынскага, гісторыка, царкоўнага дзеяча. У 1727—1735 гадах знаходзіўся ў Рыме, дзе атрымаў званне доктара багаслоўя, займаўся гісторыяй царквы, аўтар шматлікіх тэалагічных прац. У 1735-м вярнуўся на радзіму, дзе стаў архімандрытам гродзенскага Каложскага манастыра. Вывучаў гісторыю Гродна, вёскі Жыровічы на Слонімшчыне, даследаваў Каложскую царкву, склаў яе інвентар. Акрамя вывучэння царквы, ён прымаў дзейныя меры па захаванні яе будынка, які ў той час быў у стане разбурэння. Вывучаў таксама Гродзенскі Стары замак. У сваіх працах апісаў Крыж Еўфрасінні Полацкай, дзякуючы чаму рэліквія стала вядомая на Захадзе. Памёр у 1747 годзе.

**1865** год — нарадзіўся (г. Валожын) Стары Улас (Уладзіслаў Пятровіч Сівы-Сівіцкі), беларускі пісьменнік, фалькларыст. Апрацоўваў народныя паданні і легенды. Аўтар парадыйна-сатырычнага вершаванага апавядання «Тры злодзеі», паэмы «Год беларуса». Рукапісы захоўваюцца ў архівах Беларусі, Літвы, Польшчы. Памёр у 1939 годзе.

**1948** год — нарадзіўся Генадзь Пятровіч Пашкоў (в. Ліпавічы Чашніцкага раёна), беларускі паэт, публіцыст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Аўтар паэтычных зборнікаў «Зямлю слухаю», «Гравюры дарог», «Люблю, спадзяюся, жыву», кнігі нарысаў «Будзень як свята», сцэнарыя дакументальнага фільма «Я так люблю зямлю...» і інш. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**У свеце**

**1876** год — Павел Яблачкаў атрымаў патэнт на вынайдзеную ім «электрычную свечку». Сваю вынаходку вучоны прадставіў на выстаўцы фізічных прыбораў, якая праходзіла 15 красавіка 1876 года ў Лондане. На невысокіх металічных пастаментах Яблачкаў паставіў чатыры свае свечкі, абгорнутыя ў азбест і размешчаныя на вялікай адлегласці адна ад адной. Да свяцілень падвёў па правадах ток ад дынама-машыны, якая знаходзілася ў суседнім памяшканні. Паваротам рукаяткі ток быў уключаны ў сетку, і адразу прасторнае памяшканне заліло вельмі яркім, крыху блакітнаватым святлом. Поспех свечкі Яблачкава перасягнуў усе чаканні. Сусветны друк стракацеў загалоўкамі: «Вынаходка рускага адстаўнога вайскоўца інжынера Яблачкава — новая эра ў тэхніцы»; «Паўночнае святло — цуд нашага часу»... Гэтая вынаходка паклала пачатак практычнаму выкарыстанню электрычнага зараду для асвятлення.



**1932** год — РВС СССР прыняў пастанову «Аб асновах арганізацыі Ваенна-паветраных сіл РСЧА», якая паклала пачатак шырокамаштабнай рэформе ваеннай авіяцыі; было вызначана баявое значэнне і тэхнічнае развіццё ВПС як самастойнага роду войскаў.

**1983** год — прэзідэнт ЗША Рональд Рэйган вылучыў ініцыятыву распрацоўкі «стратэгічнай абароннай ініцыятывы» (САІ), якая атрымала назву «Зорныя войны», чым быў выкліканы новы віток гонкі ўзбраенняў.

## УСМІХНЕМСЯ

**Жонка, памятай: рыбкі плаваюць, але лешч можа і прыляцець!**

— Што жонка кажа, калі хоча сексу?
— Што хоча сексу.
— А ты што кажаш, калі хочаш сексу?
— Што затрымаюся на працы.

**На рабоце і акно — тэлевізар.**

Жанчына прыходзіць да ўрача:
— Доктар, цяпер у модзе маленькі бюст, а ў мяне пяты нумар. Што рабіць?
— Даношваць.

**Я, вядома, ведаў, што вы спіце на лекцыях, але надзяваць піжаму...**

— Навукоўцы сцвярджаюць, што з 2020-га працягласць года павялічыцца на адну секунду — Зямля запавольвае сваё кручэнне.
— Блін, папярэджвалі ж: не шоргайце, калі ходзіце!


caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1122.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 22 сакавіка 2018 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

23 сакавіка 2018 г. № 12 (445)




стар. 2

Сакрэты арганічнага земляробства



стар. 15

Работа любіць прафесіяналаў



стар. 16

Як супакоіць суседа

ТЭМА ТЫДНЯ

# Утрымаць кадры можна — годнымі ўмовамі працы, зарплатай і жыллём

## Так лічыць дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Лазавічы» Міхаіл АСКЕРКА

**У мінулым годзе ў Мінскай вобласці ў пошуках новага месца жыхарства і работы перасяліліся 24 сям'і (48 чалавек). Прычым з сельскай мясцовасці ў горад пераехалі 14, з горада ў вёску — 9 сем'яў, адна сям'я — з горада ў горад. Сярэдні ўзрост перасяленцаў — 34 гады.**




Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Праўда, мне давялося абзваніць не адну гаспадарку, каб знайсці адказную працавітую сям'ю. У адных казалі, што незадаволеныя работай навасёлаў — лайдакі ды гультаі. Іншыя «перасяленцы» самі адмаўляліся ад сустрэчы. І толькі Аляксей Мышалоў, які пераехаў з сям'ёй у аграгарадок Лазавічы (з аднайменнай гаспадаркай) Клецкага раёна з Нясвіжчыны, аказаўся надзвычай шчырым і адкрытым чалавекам. Мы засталі яго на мехдвары за рамонтам трактара. «Не за гарой пасяўная, трэба, каб тэхніка працавала без паломак», — заўважыў Аляксей. Быў якраз абедзенны перапынак, і ён запрасіў нас дадому — пазнаёміць са сваімі сямейнікамі, паказаць, як уладкаваліся.

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# НЕРЭНТАБЕЛЬНЫ КАЛОДЗЕЖ

Карэспандэнт «МС» высвятляла, колькі каштуе калодзежная вада



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Некалькі гадоў таму ў Мсціслаўскім раёне жыхары адной з вёсак абураліся, што за карыстанне калодзежамі ім увялі плату. Нават адмаўляліся заключаць з камунальнікамі дагаворы. Маўляў, навошта? Іх бацькі не плацілі, і яны не будуць. Насамрэч сітуацыя крыху заблытаная. Бо гэтую плату сёння бяруць толькі ў Мсціслаўскім і Быхаўскім раёнах Магілёўскай вобласці. Усе астатнія... наогул не плацяць.**

## Прынцып роўнасці?

Некалькі гадоў таму Міністэрства ЖКГ адобрыла рашэнне ўвесці плату за калодзежную ваду. Праз некаторы час яно было прыпынена, але некаторыя раёны паспелі перайсці на платны прынцып карыстання гэтай вадой. І Мсціслаўскі раён быў адным з першых. Гэта рашэнне дзейнічае тут па сённяшні дзень.

— Нам прыходзілі рэкамендацыі аблвыканкама адмяніць гэта рашэнне, але раённыя фінансісты спасылаюцца на тое, што нашы дзеянні не супярэчаць закону. Наадварот, такі падыход ставіць усіх спажыўцоў вады ў роўныя ўмовы. Чаму тыя, хто карыстаецца цэнтралізаванымі крыніцамі вады, павінны плаціць, а іншыя — не? На абслугоўванне калодзежаў таксама ідуць немалыя грошы, — кажа **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Дзмітрый ТКАЧОЎ.**

Калодзежная вада аплачваецца жыхарамі Мсціслаўскага раёна з разліку 35 літраў на чалавека ў суткі. Атрымліваецца каля 85 капеек у месяц за куб вады. Мясцовыя камунальнікі кажуць, што гэта сума нават не пакрывае іх выдаткі па рамонце калодзежаў, бо сёння патрабаванні да ўтрымання такіх аб'ектаў не тыя, што былі ў савецкі час. Зараз усё каштуе грошай. А трэба то вядро памяняць, то ланцужок паправіць. А калі сюды прыбавіць расходы па выездзе цэлай групы работнікаў, каб пачысціць калодзеж, то сума падскочыць у разы.

стар. 14

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## БУДУЧЫНЯ Ў ІХ РУКАХ

*Спікер верхняй палаты ўручыў школьнікам пашпарты*

**Пашпарты з рук Міхаіла МЯСНІКОВІЧА, старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, у Дзень Канстытуцыі 15 сакавіка атрымалі 18 хлопцаў і дзяўчат. Усе яны выдатнікі вучобы, пераможцы прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў і спартыўных спаборніцтваў.**



Спікер заклікаў школьнікаў быць актыўнымі, харызматычнымі, вылучаць крэатыўнасцю і падкрэсліў, што родная Беларусь чакае ад маладых людзей добрых ініцыятыў і смелых прапаноў. Але, у сваю чаргу, органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя ўлады заўсёды павінны быць на сувязі з моладдзю, каб быць у курсе яе ініцыятыў, перакананы старшыня Савета Рэспублікі. «Маладыя людзі будуць адчуваць сябе датычнымі да кіравання дзяржавай, вырашэння задач, якія стаяць перад рэгіёнам або краінай у цэлым. Такім чынам фарміруецца адзінства беларускай нацыі», — сказаў ён.

Маладых людзей таксама павіншавала намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна Шчоткіна. Яна падкрэсліла, што моладзь — гэта сіла, надзея і галоўнае багацце краіны. «Вы — наш гонар. Вам забяспечваць будучыню Беларусі».

## НА СВАЕ ВОЧЫ

*Парламентарыі ўзялі ўдзел у назіранні за выбарамі*

**Члены Савета Рэспублікі прынялі ўдзел у назіранні за выбарамі Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі. У міжнародным назіранні за ходам выбараў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу і Калінінградзе ў складзе місіі назіральнікаў ад СНД прынялі ўдзел члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі — старшыні пастаянных камісій Ала БОДАК, Сяргей РАХМАНАЎ, Ірына СТАРАВОЙТАВА, намеснікі старшынь Святлана ГЕРАСІМОВІЧ і Віктар СІРЭНКА.**

Беларускія сенатары наведалі выбарчыя ўчасткі, сустрэліся з кіраўніцтвам місіі назіральнікаў ад СНД, прадстаўнікамі Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі, кіраўніцтвам і членамі акруговых і ўчастковых выбарчых камісій, а таксама з назіральнікамі, якія прадстаўляюць розныя палітычныя партыі, што ўдзельнічаюць у выбарах, і назіральнікамі ад асобных краін СНД і розных міжнародных арганізацый.

## ПЫТАННІ ЛЮДЗЕЙ — ПАД КАНТРОЛЕМ

*Сенатар правяла асабісты прыём грамадзян*

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Ніна ЖАЛЯЗНОВА правяла асабісты прыём грамадзян.**

Заяўнікаў цікавілі пытанні пенсійнага забеспячэння і працаўладкавання. Парламентарый аказала садзейнічанне ў працаўладкаванні двум грамадзянам — яны будуць прыняты на працу ў сельскагаспадарчае прадпрыемства «Азярыцкі-Агра». Вырашэнне праблемы з выплатай пенсіі па выслузе гадоў, якая патрабуе дадатковага вывучэння, узята сенатарам на кантроль.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

УЗВАЖАНЫ ПАДЫХОД

# САКРЭТЫ АРГАНІЧНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА

## Ці гатовыя беларускія сельгасвытворцы да вытворчасці арганічнай прадукцыі?

**Праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб вытворчасці і абарачэнні арганічнай прадукцыі», распрацаваны спецыялістамі амаль 20 міністэрстваў, ведамстваў і арганізацый, у канцы лютага быў разгледжаны Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні і зараз рыхтуецца да першага чытання на вясенняй сесіі парламента.**



Па прагнозах спецыялістаў, праз тры гады аб'ём вытворчасці арганічных прадуктаў зойме каля 20 працэнтаў сусветнай вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі. Беларусь не стаіць убаку ад агульнасусветных тэндэнцый. Нягледзячы на тое, што ў нашай краіне арганічная сельская гаспадарка знаходзіцца пакуль яшчэ ў стадыі станаўлення, на рынку такая прадукцыя ўжо ёсць. Па даных Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, у краіне налічваецца 20 найбольш буйных вытворцаў арганічнай прадукцыі, уключаючы фермерскія гаспадаркі, асабістыя падсобныя гаспадаркі і іншыя арганізацыі. З 2009 года ў нас афіцыйна прызнаны знак маркіроўкі «Натуральны прадукт». 47 арганізацый-вытворцаў маюць права наносіць яго на 214 найменняў натуральнай прадукцыі. Акрамя таго, 14 фермерскіх гаспадарак і 3 арганізацыі харчовай прамысловасці атрымалі замежныя сертыфікаты на вытворчасць арганічнай прадукцыі. Але, на думку спецыялістаў, патэнцыйныя магчымасці развіцця айчыннай вытворчасці арганічнай прадукцыі значна шырэйшыя.

І ўсё ж, нягледзячы на рост папулярнасці прадуктаў харчавання з прыстаўкай «бія» ў насельніцтва, да праблемы арганічнай прадукцыі трэба падыходзіць узважана. На думку **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА**, прынятце заканадаўства, якое рэгулюе пытанні вырошчвання і абарачэння арганічнай прадукцыі ў нашай краіне, своечасовае і актуальнае. Але неабходна ўлічваць асаблівасці вытворчасці такой прадукцыі на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, нізкі ўзровень урадлівасці глеб, прыродна-кліматычныя ўмовы, якія не дазваляюць атрымліваць высокія ўраджаі без унясення ўгнаенняў. Бо ні для кога не сакрэт, што ў недалёкім мінулым ураджайнасць збожжавых у нас была на ўзроўні 5-7 ц/га. Акрамя таго, для пераходу на вытворчасць арганічнай прадукцыі спатрэбіцца пэўны перыяд, таму неабходна прадугледзець адпаведныя крыніцы фінансавання, арганізаваць падрыхтоўку спецыялістаў. На думку парламентарыя, неабходна вызначыць стратэгічныя мэты Беларусі па вытворчасці арганічнай сельскагаспадарчай прадукцыі, правесці эканамічную ацэнку і пралічыць усе рызыкі і выгады ўкаранення такіх тэхналогій. Пакуль жа гаворка можа ісці аб кропкавым выкарыстанні экалагічнага земляробства ў нашай краіне. Гэтым актыўна могуць займацца фермерскія і асабістыя падсобныя гаспадаркі.

Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні накіравала ў Палату прадстаўнікоў пісьмо з прапановамі дапоўніць адпаведнымі часткамі праект закона «Аб вытворчасці і абарачэнні арганічнай прадукцыі» і арганізаваць яго актыўнае абмеркаванне з прыцягненнем навукова-практычных цэнтраў, усіх зацікаўленых дзяржаўных органаў і арганізацый, а таксама грамадскасці нашай краіны.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ПРЫЙШОЎ!

# ЖЫЦЦЁ ПАДКАЖА НАДЗЁННЫЯ ПРАБЛЕМЫ

**У Брэсцкай вобласці пасля апошніх выбараў у значнай меры памяняўся склад старшынь раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў. Прадстаўнічыя органы раённага звяна ўзначалілі людзі самых розных прафесій і сфер дзейнасці. Сярод іх — работнікі банка і жыллёва-камунальнай сферы, намеснікі старшынь выканкамаў і кіраўнікі сацыяльных службаў, начальнік МНС і старшыня сельскага Савета. У некаторых сфера цяперашняй дзейнасці пераклікаецца з ранейшай работай, у іншых прафесійныя інтарэсы да гэтага адносіліся да больш вузкай галіны. «МС» пацікавілася, на што маюць намер звярнуць першачарговую ўвагу новыя старшыні, з чаго пачнуць сваю работу?**

**Рыгор КАСАБУЦКІ, старшыня Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў:**

— Шмат гадоў я працаваў у сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі, апошнія дзесяцігоддзе — дырэктарам ЖКГ. Практычна штодня даводзілася сустракацца з людзьмі, вырашаць іх праблемы, а таксама праблемы вялікай гарадской гаспадаркі. Так што ў многім мая цяперашняя работа пераклікаецца з ранейшай. Добраўпарадкаванне двароў і вуліц, паляпшэнне якасці жыцця грамадзян — у ліку прыярытэтных задач дэпутацкага корпуса. Над гэтым і будзем працаваць. У нашым горадзе ёсць добры вопыт дзейнасці камітэтаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. На іх узор, думаю, трэба арганізоўваць новыя фарміраванні, усяляк прыцягваць людзей да стварэння прыгажосці, утульнасці, зручнасці ў дварах і пад'ездах. А для гэтага варта паказваць вопыт суседзяў іншым гараджанам на семінарах, выязных нарадах, хай сабе і зусім невялікіх.

**Алег ЯКУБЧЫК, старшыня Маларыцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Мая ранейшая працоўная дзейнасць у меншай ступені была звязана з праблемамі, якія паўстаюць на парадак дня сёння. Апошнія 22 гады я працаваў у банкаўскай сферы, больш за дзясятак гадоў кіраваў раённым аддзяленнем «Беларусбанка» і дэпутатам райсавета сёлета абраны ўпершыню. І паколькі мая акруга ўключае ў сябе прыватны сектар райцэнтра, большасць людзей датычыліся паляпшэння стану дарог, вулічнага асвятлення. Вось і гэта і будзе пунктам прыкладання нашых сіл.

Ведаю, што ёсць нараканні ў вясковых жыхароў на арганізацыю закупу малака ў насельніцтва. Яно і зразумела: раней, калі вёскі былі густанаселеныя, кароў на падворках трымалі многа і пытання не ўзнікала, бо ўсё было адладжана. А цяпер, калі адна прыватная карова ўтрымліваецца за пяць кіламетраў ад другой, не проста бывае ахапіць усіх гаспадароў зборам малака. Вось і давядзецца са старшынямі сельскіх Саветаў унікаць у сутнасць праблемы, глядзець, чым можна дапамагчы. Думаю, жыццё падкажа надзённыя пытанні, якія трэба вырашаць.

**Уладзімір ХВАЦІК, старшыня Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў:**

— Да раённага Савета я шмат гадоў узначальваў Дамачаўскі сельскі Савет. Пасёлак Дамачава — былы райцэнтр і сёння ўяўляе сабой немалы населены пункт з разнастайнай інфраструктурай. Акрамя таго, у склад сельсавета ўваходзіць шэраг іншых вёсак, у тым ліку маленькіх, аддаленых. Увесь час даводзілася вырашаць праблемы транспартнага абслугоўвання, дарог ды іншыя. Так што работай прыйдзецца займацца такой жа, як раней, толькі ў раённым маштабе. Зыходзячы з ранейшага вопыту, упор думаю рабіць на добраўпарадкаванне, паляпшэнне якасці жыцця нашых сельскіх жыхароў. Гэта азначае медыцынскае, гандлёвае, культурнае абслугоўванне. Добра, што ў нас дэпутацкі корпус складаецца з людзей самых розных прафесій. Так што разам з калегамі будзем выпрацоўваць план работы і прыкладаць намаганні для яго выканання.

**Аляксандр ЯРАШЭВІЧ, старшыня Столінскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Мне работа ўяўляецца зусім не новай, яна шчыльна пераклікаецца з маімі ранейшымі заняткамі. На пасаду старшыні райсавета я прыйшоў з пасады начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва. Значыць, клопат пра адзінокіх, тых, хто пражывае адзінока, інвалідаў раней ажыццяўлялі праз сацыяльных работнікаў, а цяпер будзем рабіць гэта праз сельскія Саветы. Пэўны адрэзак маёй працоўнай біяграфіі быў звязаны з жыллёва-камунальнай гаспадаркай, а пытанні добраўпарадкавання прыярытэтныя для мясцовай улады. Што датычыцца працы з людзьмі, то я атрымаў гэты вопыт падчас работы ў парламенце. Гэта і прыёмы выбаршчыкаў, і вырашэнне іх пытанняў. Так што справа ў многім знаёмая, проста цяпер яна набывае крыху іншыя формы. Варта адзначыць, што раён у нас вялікі, тэрыторыя падзелена на 20 сельсаветаў. Думаю, разам са старшынямі мясцовых органаў улады, дэпутатамі будзем працаваць на карысць выбаршчыкаў.

**Мікалай КУДРАВЕЦ, старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў:**

—У райвыканкаме, дзе я працаваў намеснікам старшыні, курыраваў пытанні сацыяльна-культурнай сферы. Цяпер іх таксама не намераны ўпускаць з поля зроку. У нашым раёне шмат цікавых людзей у гістарычным і культурным плане мясцін. Зараз, у Год малой радзімы, асабліва важна звярнуць увагу на кожную аддаленую вёску — гэта ж нечая малая радзіма! А работы сельскім Саветам, дэпутацкаму корпусу раёна хопіць. Сёлетняя позняя вясна прыспешвае заняцца навядзеннем парадку. Зрабіць гэта трэба хутка і арганізавана.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

# КАЗУРКІ І БУРАЛОМЫ ВЫКЛІКАЛІ ЗМЯНЕННЕ КОДЭКСА

**Выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы прайшло ў Гомелі на базе Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук. Сярод асноўных пытанняў — абмеркаванне праекта закона «Пра ўнясенне дапаўненняў і змяненняў у Лясны кодэкс Рэспублікі Беларусь».**



Фeрамонавая пастка для караеда.

— Мы плануем дапоўніць Лясны кодэкс лесагаспадарчымі мерапрыемствамі, — адзначае **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна КАНАНЧУК.** — Змены ў Лясным кодэксе будуць накіраваны на захаванне біялагічнай устойлівасці беларускага лесу і эфектыўнасць лясной галіны. Размова ідзе пра адвод і таксацыю ўчасткаў, лесасек, утрыманне лесагаспадарчых дарог, расчыстку і падрыхтоўку плошчаў для гадавальнікаў, плантацый насення. Гэтым пытанням будуць прысвечаны змяненні, якія прапануе законапраект. Сумесна з Міністэрствам лясной гаспадаркі, Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, іншымі зацікаўленымі ведамствамі важна ўнесці тыя нормы, якія дазволяць захаваць біялагічную ўстойлівасць нашага лесу і эфектыўнасць лясной галіны.

У апошнія гады пагодныя фактары негатыўна ўздзейнічаюць на беларускі лес. Напрыклад, у 2016-м з-за шквалістых вятроў, бураломаў, якія сталі амаль традыцыйнымі для поўдня краіны, спатрэбілася правядзенне санітарна-аздараўленчых мерапрыемстваў на плошчы ў больш за 70 тысяч гектараў. У тым ліку суцэльныя санітарныя рубкі вяліся на плошчы амаль 16 тысяч гектараў. Гэта істотна адбілася на структуры ляснога фонду.

— Наступствы неспрыяльных пагодных умоў паказалі неабходнасць пераразліку памеру рубкі пры надзвычайных сітуацыях, — адзначыла Таццяна Кананчук. — У дзейнай рэдакцыі кодэкса гэта не прадугледжана.

**Начальнік упраўлення лясной гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Мікалай ЮРЭВІЧ** адзначыў, што ўдасканаленне Ляснога кодэкса, які ў цэлым з'яўляецца актуальным дакументам і дазваляе празрыста працаваць у лясной гаспадарцы, дазволіць спрасціць парадак водпуску драўніны з пашкоджаных участкаў:

— Каб зняць усе адміністрацыйныя непатрэбныя бар'еры, каб насельніцтва змагло нарыхтоўваць дровы для асабістых патрэб... Да таго ж прыродныя ўмовы, з якімі мы сутыкнуліся апошнім часам, — усыханне лесу, праблемы з бураломамі, масавае распаўсюджванне жука-шкодніка, — дыктуюць неабходнасць удасканалення нашага ляснога заканадаўства.

У Інстытуце лесу Нацыянальнай акадэміі навук парламентарыі пазнаёміліся з навукова-даследчай дзейнасцю па пытаннях захавання, абароны, аднаўлення і рацыянальнага выкарыстання лясных генетычных рэсурсаў Беларусі, а таксама з распрацоўкамі і рэкамендацыямі па надзённых праблемах: усыханні хваёвых, распаўсюджванні караеда.

Гэтыя казуркі, якія некалі, у звычайных умовах, лічыліся нават першаснымі санітарамі лесу, бо з'ядалі толькі засохлыя дрэвы, сёння сталі вялізнай праблемай, якая патрабуе тэрміновага вырашэння. **Дырэктар Інстытута лесу Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр КАВАЛЕВІЧ** гаворыць, што менавіта цяпер адначасова ўзнікла шмат фактараў, якія дазволілі яму размножыцца:

— Напрыклад, у мэтах захавання біяразнастайнасці забаранілі спальваць галіны... Праведзеныя летась мерапрыемствы павінны сёлета даць эфект — хаця б стабілізацыю сітуацыі з караедам. Сёлета многа снегу, значыць, будзе шмат і вільгаці, што добра для лясоў. Але ж павінны быць яшчэ і спрыяльныя летнія тэмпературы. Бо анамальна высокія таксама выклікаюць стрэс у дрэў, павялічваецца спажыванне імі вільгаці, зніжаецца фотасінтэз... У выніку зніжаецца выпрацоўка жывіцы. А жывіца — гэта асноўны элемент абароны дрэва. Калі шкоднік спрабуе ўкараніцца, жывіца яго засмальвае, і ён гіне. За апошнія гады знізілася колькасць жывіцы, і для караеда з'явілася шмат кармавой базы. Наша задача — не толькі рубкі дрэў. Сёння важна знізіць колькасць шкоднікаў, знішчыць караеда. Да 15 красавіка пастаўлена задача поўнасцю вырубіць пашкоджаныя ўчасткі.

Высечкі з-за заражэння жуком-караедам падлягаюць яшчэ каля чатырох тысяч гектараў лесу. Тым часам Міністэрства лясной гаспадаркі закупіла 13,5 тысячы ферамонных пастак для глабальнага маніторыгу вяршыннага і шасцізубчатага караеда. Іх плануюць усталяваць ужо ў красавіку. Ферамонныя прэпараты — сумесная распрацоўка Інстытута лесу і БДУ.

Дырэктар Інстытута лесу гаворыць, што ў цяперашняй рэдакцыі Ляснога кодэкса няма нормы, якая дазваляла б у выпадку ліквідацыі наступстваў стыхійных сітуацый рабіць лесасекі. Яшчэ і па гэтай прычыне складваецца напружаная лесапатагенная абстаноўка. Менавіта таму важна, каб юрыдычныя асобы, якія вядуць лясную гаспадарку, маглі аператыўна праводзіць санітарна-аздараўленчыя мерапрыемствы: абследаванне, улік хворых насаджэнняў, вырубкі санітарныя і суцэльныя, вываз драўніны, яе рэалізацыю, спальванне высякальных астаткаў.

Падчас выязнога пасяджэння яго ўдзельнікі наведалі лабараторыі Інстытута лесу, а таксама Макееўскае лясніцтва Гомельскага лягаса, дзе азнаёміліся з практыкай правядзення санітарна-аздараўленчых мерапрыемстваў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

УСЁ ДЛЯ РЭГІЁНАЎ

# ЯК ПРЫЦЯГНУЦЬ БІЗНЕСМЕНА,

## або Інвестар... як нявеста

**У Віцебскай вобласці з'яўляецца ўсё больш прыкладаў прыцягнення значных інвестыцый. Гэта нядаўна канстатаваў старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў. І агучыў задачу кіраўнікам мясцовай улады: трэба яшчэ больш актыўна ставіцца ў глыбінцы прывабныя ўмовы для дзелавых людзей. Каб актыўна інвеставалі, каб арганізоўвалі і развівалі ў першую чаргу вытворчасць.**

### І ЛАГІСТЫЧНЫ КОМПЛЕКС

«Нераўнамернае развіццё рэгіёнаў уплывае на якасць жыцця людзей, і таму сітуацыю неабходна выраўноўваць. Адзін з дзейсных механізмаў — прыцягненне інвестараў. Пакуль у краіне самая высокая канцэнтрацыя прадпрымальных людзей у сталічным рэгіёне. На жаль, не вельмі хочуць бізнесмены ісці на перыферыю і развіваць там вытворчасць. У іх на тое ёсць свае падставы і цэлы шэраг аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын», — сказаў губернатар. Актывізацыі ў інвестыцыйным пытанні чакаюць і на ўзроўні кіраўніцтва краіны. Стаўка робіцца на інавацыі і эксклюзіўнасць.

Паводле інфармацыі камітэта эканомікі аблвыканкама, у паўночным рэгіёне ўжо ёсць унікальныя праекты, якія паспяхова рэалізуюцца.

У прыватнасці, на слыху стварэнне недалёка ад Оршы мультымадальнага прамыслова-лагістычнага комплексу. Нагадаю, Прэзідэнт даручыў наогул стварыць у Аршанскім раёне самыя лепшыя ўмовы для жыцця людзей, у тым ліку для бізнесу. І калі ўсё атрымаецца, вопыт потым будуць выкарыстоўваць у іншых рэгіёнах. Да канца 2023 года тут плануецца ўзвесці згаданы вышэй комплекс. Для гэтага выдзелены 231 га зямлі недалёка ад пасёлка Балбасава. Там плануецца выкарыстаць 190 тысяч квадратных метраў пад складскія плошчы і 280 тысяч «квадратаў» — пад вытворчыя. А таксама стварыць бізнес-цэнтр, гатэль, паркоўкі і многае іншае.

Вялікі інтарэс да комплексу праяўляюць інвестары з розных краін, у прыватнасці з Кітая.

### ЮАНІ Ў НАША МАЛАКО

Цікава, дарэчы, што прадстаўнікоў КНР вельмі цікавіць і беларуская малочка. У прыватнасці, карпарацыя DRex пажадала стварыць усяго за чатыры гады сучасныя малочнатаварныя фермы. Яна ж інвесце ў перапрацоўку. Больш таго, прадстаўнікі фірмы гатовыя вучыць персанал, а прадукцыю экспартаваць. Адпаведны дагавор падпісалі ў канцы мінулага года.

З Кітайскай нацыянальнай карпарацыяй па эканамічным супрацоўніцтве з замежнымі краінамі дасягнута дамоўленасць па прыцягненні інвестыцый для будаўніцтва сямі малочнатаварных ферм на 2000 галоў кожная.

Кітайцы, між іншым, паралельна цікавяцца і турыстычным патэнцыялам Прыдзвіння.

А ў Гарадоцкім раёне адзін з вядучых у Еўропе сельскагаспадарчых канцэрнаў — з Расіі — ужо паспяхова зарабляе на эксплуатацыі пабудаваных малочных комплексаў.

### РАЗУМНЫ... КОШЫК КРАМЫ

Група кампаній «Мадэрн-Экспа» — вядучы вытворца і пастаўшчык гандлёвага абсталявання ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе — у Віцебску мае паспяховую вытворчасць. Сёлета запланаваны выраб інтэлектуальных кошыкаў і кас самаабслугоўвання. У выніку, што лагічна, можна будзе абысціся без гандляроў. Яшчэ вельмі цікавая навінка — паштамат: інтэлектуальны «пункт» выдачы тавараў. Безумоўна, улічваючы, што пакупкі па інтэрнэце становяцца ўсё больш папулярнымі, попыт на такую прадукцыю абяцае быць добрым. Тым больш што карыстанне «тэрміналам-ячэйкай» зручнае для пакупнікоў. Ён дазволіць сэканоміць час і не траціць нервы ў чарзе па выдачу заказаў.

З удзелам замежных інвестараў вядзецца будаўніцтва ў Мёрскім раёне прадпрыемства па вытворчасці тонкага металічнага ліста і белай бляхі. Гэты праект рэалізуецца ў рамках Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады. Дарэчы, аналагічнай прадукцыі на тэрыторыі былога СССР не вырабляюць.

### ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ЛЕКІ

У Бешанковічах набірае абароты вытворчасць медыкаментаў. У планах — выраб эфектыўных сродкаў для кожнага хворага індывідуальна. Лагічна, што адна доза для ўсіх — неэфектыўнае лячэнне. А калі «пад кожнага» — з улікам вагі, асаблівасцяў арганізма, стану імуннай сістэмы і гэтак далей, тыя ж пілюлі акажуць аптымальнае ўздзеянне. Гэта дазволіць найлепш змагацца з цяжкімі захворваннямі, напрыклад ракам. Інвестары — прадстаўнікі Беларусі, Індыі, Літвы, Славакіі. У ліку іншых вялікія планы на бізнес у названым райцэнтры і ў кампаніі, якая належыць расійскаму алігарху Барысу Абрамовічу.

У Аршанскім раёне засвоілі вытворчасць аўтаматычнай сістэмы, якая кіруе апырскваннем пасеянага.

**Часта бываючы ў рэгіёнах, перыядычна пытаўся ў кіраўнікоў мясцовай улады, чаму менавіта ў іх раёне адкрыўся буйны завод. Чым горшы суседні, дзе такія ж кліматычныя ўмовы, цудоўная прырода, працавітыя людзі і таксама ёсць нерухомасць, якую можна набыць за капейкі? Як пажартаваў адзін старшыня райвыканкама, «інвестар — як нявеста. Трэба яго па-добраму зачараваць і даказаць, што ты — самы лепшы, што інвестару неабходны менавіта твой рэгіён!» А мае ж чалавек рацыю!**

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Утрымаць кадры можна — годнымі ўмовамі працы, зарплатай і жыллём

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*



На падворку сустракае брэхам сабака. Побач яшчэ адна будка, з якой баязліва выглядвае другі — невялічкі. «Гэта Байкал і Марта, члены нашай сям'і», — смяецца Аляксей.

— Няўжо на новым месцы завялі ахоўнікаў? — цікавімся мы з фотакарэспандэнтам.

— З сабой прывезлі. Марта жыла ў нас раней, а Байкал прыбіўся аднекуль. Ды гэта яшчэ не ўся гаспадарка: козы, трусы, качкі, куры. А ў доме — кошка Тоня і кацяня Фелікс, — паказвае Аляксей.

— Кошку мы падабралі на вуліцы яшчэ дзіцем. Фелікс — яе сын. Кацянят раздаём у добрыя рукі, а гэтага пухнатага пакінулі сабе. Напачатку кошку не выпускалі з дому, баяліся, што ўцячэ. Цяпер, калі прывыкла, выходзіць пагуляць, мышэй ловіць. А коцік гультай, любіць бавіць час у цяпле, — жартуе Таццяна.

Адразу відаць, у сям'і любяць братоў нашых меншых, клапоцяцца аб іх: на кожным ашыйнік ад паразітаў. Стаўленне да жывёлы — сведчанне таго, што тут жывуць душэўныя, адкрытыя і добрыя людзі.

— Пераезд падобны на пажар. Не ўяўляеце, які вэрхал стаяў, калі лавілі сваіх гадаванцаў, птушку ў мяхі «пакавалі» ды ў багажнік складвалі, ну а каты ды сабакі, як арыстакраты, ехалі з намі ў кабіне, — успамінаюць гаспадары.

З цягам часу Аляксей і Таццяна плануюць расшырыць хатнюю гаспадарку — набыць парсючкоў.

— Мы прывыклі да сваіх, натуральных прадуктаў харчавання, якія атрымліваем з падсобнай гаспадаркі. У краме купляем самае неабходнае: хлеб, малако, соль, цукар, макарону, крупы. Вясной засеем прысядзібны ўчастак у пятнаццаць сотак, будуць хатнія закаткі на наступную зіму, — радуецца гаспадыня.

— Жылі ў суседнім Нясвіжскім раёне ў бараку, без усякіх выгод. Далёка было дабірацца ў аграгарадок, на работу. Але самае галоўнае, хацелася мець нармальнае, уладкаванае жыллё. Таму і прынялі асэнсаванае рашэнне пераехаць, — расказаў Аляксей.

У Лазавічах сям'і выдзелілі «прэзідэнцкі» домік: тры прасторныя пакоі, прыхожая, кухня, санвузел. Ацяпляецца памяшканне з дапамогай катла, але ў недалёкай перспектыве сюды прыйдзе «блакітнае» паліва — ужо рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя. З цягам часу гаспадары плануюць зрабіць у доме рамонт: замяніць шпалеры і сантэхніку, пафарбаваць падлогу, вокны, дзверы... І купіць машыну.

Адкрытым акцыянерным таварыствам «Лазавічы» вось ужо каля дваццаці гадоў кіруе Міхаіл Аскерка. Гаспадарка — адна з моцных у Клецкім раёне. Дырэктар разумее, што прыцягнуць добрыя, працавітыя кадры можна зарплатай, годнымі ўмовамі працы і пражывання. Таму шмат увагі аддае будаўніцтву жылля. Побач з традыцыйнай драўлянай забудовай як грыбы пасля дажджу вырастаюць сучасныя катэджы. А інфраструктура не саступае гарадской. Вуліцы, пад'езды да вытворчых аб'ектаў, жывёлагадоўчых фермаў заасфальтаваныя. У Лазавічах ёсць магазіны, сельскі Дом культуры, бібліятэка, дзіцячы сад, што асабліва задавальняе шматдзетную сям'ю, дзе выхоўваюцца тры сыны. Максіму — шэсць, Глебу — чатыры, Арцёму — тры гады. Сярэдні ходзіць у дзіцячы сад, малодшы — толькі збіраецца, а старэйшы — першакласнік. Хлопчыка маці возіць у школу ў суседні аграгарадок Морач. «Кожную раніцу падымаю сына ў сем гадзін. Але ён устае ахвотна, з радасцю збіраецца. Яму падабаецца вучыцца, ехаць на аўтобусе, глядзець у акно — новыя ўражанні, захапленні», — кажа Таццяна.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

У Лазавічах ёсць свая амбулаторыя. Калі захварэюць малыя, не трэба везці іх у раённую паліклініку. Урач агульнай практыкі заўсёды выслухае, прапіша лекі. Тут можна памераць ціск, палячыць зубы, зрабіць электракардыяграму, аналіз крыві. У медыцынскай установе працуе стацыянар, дзе праводзяць розныя працэдуры.

— Нам тут падабаецца, ёсць жыллё, работа. Зарплата таксама задавальняе. Пачнуцца пасяўная, жніво, мяркую, буду зарабляць больш, — лічыць Аляксей.

— А як наконт адпачынку? — пацікавілася ў сваіх суразмоўнікаў.

— Уходзімся па гаспадарцы, дзяцей спаць пакладзём, тэлевізар паглядзім, у інтэрнэце пасядзім — вось і ўсе захапленні. Клуб не наведваем: няма часу. У дзіцячым садзе розныя мерапрыемствы ладзяць, разам з малымі запрашаюць і бацькоў. Зрэдку ўдаецца вырвацца да таты і мамы на Піншчыну, — канстатуе Таццяна. — Няма на каго пакінуць дзяцей ды жыўнасць.

Бацька Аляксея якраз прыехаў пагасціць да сына і нявесткі. «Жыллё сапраўды не параўнаць з папярэднім, — адзначае ён. — Я рады, што ўсё задавальняе дзяцей. Добра ім — добра і мне».

Таццяна пакуль мала ведае тутэйшых людзей, больш займаецца сямейнымі справамі, малымі. Але вясной стане весялей, можна будзе пагуляць у дэндрапарку, які калісьці заклаў аграном Мікалай Гардзей. Дрэвы пад яго кіраўніцтвам высаджвалі людзі розных пакаленняў і ўзростаў. У памяць аб земляку тут устаноўлены спецыяльны знак, праводзяцца значныя мерапрыемствы, святы, у тым ліку і раённыя.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## У ТЭМУ

**Міхаіл АСКЕРКА, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Лазавічы»:**

— Да сям'і Мышаловых мы адразу прыглядваліся. Яны прыехалі да нас збоку, цікава было, як сябе пакажуць, якія работнікі. Ды і яны прывыкалі да нашых умоў, традыцый: у розных мясцовасцях яны розныя. Скажу, моладзь нядрэнная, але, бывае, даводзіцца і вучыць, і дапамагаць. Думаю, з цягам часу ў іх усё атрымаецца. Хутка выйдзе на работу і Таццяна: яе запрасіла загадчыца сталовай.

У нас працуе і жыве нямала маладых сем'яў. Але Лазавічы, можна сказаць, ускраіна Клецкага раёна, таму людзей трэба ўтрымліваць годнымі ўмовамі працы, зарплатай, жыллём. За мінулы год мы спрацавалі нядрэнна, атрымалі добры ўраджай збожжавых і зернебабовых, нарыхтавалі дастаткова кармоў для грамадскага статка. А гэта малако, а значыць, прыбытак, заробкі, магчымасць развівацца. У гаспадарцы за апошнія гады пабудавана больш як 75 катэджаў, плануецца ўзвесці яшчэ тры. Да паслуг работнікаў утульны клуб, сярэдняя школа. Але вучыцца тут не вельмі шмат дзяцей. Летась першакласнікаў было толькі двое. Ды школу, лічу, закрываць не варта. Калі малыя растуць у сваім аграгарадку, то большы шанц, што яны тут і застануцца пасля школы або вернуцца пасля заканчэння навучальных устаноў на малую радзіму.

У КРАІНЕ

## ПЕРАСЕЛЯЦЬ ТОЛЬКІ РАЗ

**Летась садзейнічанне ў перасяленні на новае месца жыхарства і працы было аказана 136 сем'ям беспрацоўных. Найбольшая колькасць (61 працэнт) пераехала з вёскі ў вёску, траціна — з горада ў вёску. Яшчэ тры сям'і памянялі вёску на горад і чатыры перабраліся з горада ў горад.**

Перасяленне ў асноўным ажыццяўляецца ў межах вобласці — 83 працэнты засталіся пражываць на тэрыторыі свайго рэгіёна. З тых сем'яў, што змянілі вобласць, палова пераехала на Міншчыну.

У складзе перасяленых сем'яў 252 чалавекі, з іх у працаздольным узросце — 176. Астатнія — гэта дзеці да 16 гадоў. Сярэдні ўзрост працаздольных членаў — 31 год.

Сёлета дапамогу ў пераездзе на новае месца жыхарства і працы плануюць аказаць 142 сем'ям: 35 у Віцебскай вобласці, 32 — у Мінскай, 30 — у Магілёўскай, 21 — у Гомельскай, 18 — у Гродзенскай, 6 — у Брэсцкай. Калі ахвотных будзе больш, то іх таксама ўключаць у праграму.

Беспрацоўных перасяляюць у мясцовасці, дзе ёсць вакансіі з выдзяленнем жылля. Даведацца пра іх можна на партале дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва ці ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне выканкама. Дапамогу ў перасяленні аказваюць толькі адзін раз.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

**Аляксей КАРАЛЕНЯ, намеснік начальніка ўпраўлення па занятасці насельніцтва —начальнік аддзела рынку працы камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама:**

— Правы на аказанне садзейнічання ў перасяленні на новае месца жыхарства і работы маюць беспрацоўныя. Паўналетнія члены сям'і перасяляюцца толькі з іх пісьмовай згоды. Беспрацоўныя заключаюць дагавор аб сваім перасяленні і перасяленні членаў сям'і. Пасля чаго ім выплачваюць грашовую суму ў памеры сямікратнай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму, які дзейнічае на дату працаўладкавання. Дадаткова выплачваецца таксама двухразовая велічыня пражытковага мінімуму пры перасяленні беспрацоўных з гарадоў на новае месца жыхарства і работы ў малыя, сярэднія гарадскія населеныя пункты, у сельскую мясцовасць, а таксама гарады-спадарожнікі.

Перасяленне беспрацоўных і членаў іх сем'яў адбываецца ў выпадку атрымання работы і жылля.

Пераезд і працаўладкаванне ажыццяўляюцца ва ўзгодненыя з наймальнікам тэрміны, прадугледжаныя ў дагаворы. Як сведчыць практыка, перасяленцы ўладкоўваюцца ў асноўным па прафесіях і спецыяльнасцях сельскагаспадарчага профілю: жывёлаводы, аператары машыннага даення, трактарысты, загадчыкі ферм, заатэхнікі, кіроўцы і інш.

Адна з праблем — беспрацоўныя ў асноўным выказваюць пажаданне перасяліцца ў прысталічныя рэгіёны. Аднак магчымасці выдзялення жылля ў раёнах непадалёку Мінска абмежаваныя. Акрамя таго, нават пры наяўнасці жылля часта кваліфікацыя беспрацоўных не адпавядае патрабаванням гаспадаркі.

## Наталля НЕМАГАЙ:

# «МАРЫЛА СТАЦЬ АКТРЫСАЙ»

**Наталля Немагай — адна з самых вядомых беларускіх тэлевядучых. На канале АНТ яна працуе ледзь не з самага яго ўтварэння, прычым трапіла туды пасля «народнага» кастынгу, калі вядучых выбіралі гледачы. Пра выпадковасць, якая стала прафесіяй, і тое, як захаваць прыгажосць, а таксама навошта шмат чытаць, вучыць замежныя мовы і асвойваць музычныя інструменты, Наталля расказала, гасцінна запрасіўшы да сябе дадому на каву.**



З сынам Валодзем.

***— Наталля, паколькі жывяце ў самым цэнтры Мінска, адносіцеся да тых, каго не раздражняе гарадскі шум і мітусня?***

— Так, я цалкам гарадскі жыхар. У цэнтр мы з бацькамі пераехалі, калі мне было 13, таму я тут амаль з дзяцінства. Хоць у нас ёсць дача, быў домік у вёсцы, дзе жылі мае бабуля і дзядуля, але з дзяцінства я не любіла праводзіць лета за горадам. Дзіця асфальту — гэта пра мяне. Вельмі люблю цэнтр Мінска, бо ты заўсёды ў віры падзей. Можна нават нікуды не выходзіць, ты і так усё бачыш. Летам з кубкам кавы выходзіш на балкон, і адчуваеш, як прачынаецца Мінск. Гарадскі рытм вельмі пасуе майму жыццю. Ці напружвае шум на праспекце? Ніколькі! У мяне няма кандыцыянераў, летам сплю з адчыненымі вокнамі. Куды горш, мне здаецца, адчувала б сябе ў цішыні. Ёсць нават такое даследаванне вучоных, што ні ад чаго чалавек так не вар'яцее, як ад цішыні. Калі цалкам прыбраць усе гукі, страціць розум можна за сем хвілін...

***— А калі ўсё ж неабходна адпачыць?***

— У мяне звычайна няма часу кудысьці паехаць, скажам, на выхадныя, таму калі трэба адпачыць, аднавіць сілы, я кажу блізкім: не чапайце мяне 20 хвілін, і зачыняюся ў пакоі з кніжкай. Гэта найлепшы для мяне сродак, каб апрытомнець. Кнігу заўсёды нашу з сабой і чытаю: у грымёрцы, калі робяць прычоску, калі чакаю сына ў паліклініцы, калі даводзіцца ездзіць у транспарце — усюды, дзе ёсць вольныя хвіліны.

***— І што чытаеце?***

— Пераважна класіку. На мой погляд, у прафесіі журналіста, тэлевядучага гэта неабходна, бо нішто іншае так не ўзбагачае мову. Аддаю перавагу ў асноўным рускім аўтарам — Чэхаву, Дастаеўскаму, Талстому. Часам чытаю казкі на італьянскай, паколькі вывучаю гэту мову. Узровень у мяне, канешне, пакуль не такі, каб чытаць Дантэ Аліг'еры ў арыгінале, а вось у казках вельмі прыгожая і зразумелая мова.

Класічную літаратуру я, дарэчы, люблю чытаць услых. Нават калі сын зусім маленькі ляжаў у калысцы, я чытала Талстога, Дастаеўскага. Некаторыя называюць Дастаеўскага складаным аўтарам, а я зачытвалася яго творамі яшчэ ў школе. Люблю і родную мову. Вось зараз чытаю Івана Шамякіна, напрыклад. Гэта і сыну карысна. Добра, што ў школе больш увагі сталі ўдзяляць вывучэнню беларускай мовы. Наведваем з сынам і спектаклі, любім, напрыклад, тэатр беларускай драматургіі. Важна ж не проста сказаць, што трэба чытаць, а зацікавіць, каб у дзіцяці ўзнікла адчуванне, што сапраўды гэта вялікі пісьменнік ці твор. І каб у яго самога з'явілася жаданне пачытаць гэту літаратуру.

***— Ці атрымалася далучыць да чытання сына?***

— Пакуль не зусім. Ён не столькі любіць чытаць сам, як слухаць, калі чытаю я. Мы дамаўляемся: некалькі старонак чытае ён, і астатняе — я. Валодзя загружаны разнастайнымі заняткамі, таму я пакуль дапускаю гэта. Вельмі хутка пройдзе час, калі ён прасіць, каб я пачытала. Таму я карыстаюся момантам і атрымліваю ад яго асалоду.

***— Чым вас зацікавіла італьянская мова?***

— У інстытуце вывучала латынь, а італьянская цалкам на ёй пабудаваная. Ды і ў нашай мове шмат з латыні, мне яе вывучаць было вельмі цікава. Займаюся ў вучэбным цэнтры пры пасольстве. У нас шмат сустрэч з італьянцамі, семінараў, фільмаў, я заўсёды з радасцю іду на заняткі. Вельмі люблю Італію, мы з сынам там праводзім адпачынак: ездзім і на лыжах катацца, і летам на мора. Італьянцы на англійскай мове не вельмі любяць размаўляць, лічаць, што іх мова таксама вялікая. Каб добра іх разумець, адкрываць для сябе гэту краіну, лепш ведаць мову. Таму такое ў мяне хобі. Дарэчы, лічыцца, што ў чалавека дамінуе адно паўшар'е мозга, а развіццю другога спрыяе ігра на музычным інструменце і вывучэнне замежных моў. Паколькі музычны інструмент, фартэпіяна, я асвоіла ў дзяцінстве, то застаецца ўдасканальваць замежную мову. Сын, дарэчы, таксама наведвае музычную школу, іграе на ксілафоне.

***— Вы 14 гадоў таму прыйшлі на тэлебачанне. У кастынгу на АНТ тады сапраўды ўдзельнічала пяць тысяч ахвотных?***

— Так, і гэта першы выпадак у гісторыі нашага тэлеканала, калі быў так званы народны кастынг: ва ўсіх рэгіёнах, у розных гарадах праводзілі апытанні і выбіралі вядучых. Спачатку абралі мужчын. А потым шукалі жаночы твар, у выніку ўзялі шэсць або сем вядучых, і я была ў іх ліку. На першым этапе нас адбіралі па фотаздымках, потым запрашалі на гутарку, пасля мы прыходзілі пачытаць штосьці ў студыі... І кожны раз я не ведала, ці паклічуць мяне на наступны этап. І заўсёды была вялізная колькасць дзяўчат. Памятаю, каб пакінуць сваю анкету, я стаяла ў доўгай чарзе — яе хвост цягнуўся ад будынка тэлеканала да набярэжнай Свіслачы.

***— Пабачыўшы такую канкурэнцыю, не хацелася ўсё кінуць?***

— Я ніколі не марыла быць тэлевядучай, таму, напэўна, і не расстроілася б моцна, калі б мяне не ўзялі. Хоць бачыла я сябе ўсё ж у творчай прафесіі — актрысай, спявачкай, музыкантам. З дзяцінства была вельмі актыўная — іграла на фартэпіяна, займалася ў гуртку пры рускім драматычным тэатры імя Горкага, спявала ў хоры, іграла ў ансамблі. Калі мне было 17, мама адвезла мяне ў Маскву да Клары Лучко, нашы сем'і тады сябравалі. Яна сказала, што шанцы трапіць у тэатральны ёсць і трэба спрабаваць. Я была прыгожая, высокая, з экзатычнай знешнасцю. Мяне запрашалі мадэльныя агенцтвы. Здымалася ў рэкламных роліках, была тварам ювелірнага магазіна. Але гэта былі разавыя акцыі.

***— Самі ўсё ж чаго хацелі?***

— Паступіць ва Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі і стаць актрысай. Засынала і ўяўляла сябе ў розных вобразах — Наташы Растовай напрыклад. Хоць і ў душы я была Наташа Растова. Але дзіцячыя мары так і засталіся дзіцячымі марамі. Бо бацькі не рызыкнулі ў «ліхія» 90-я мяне адну адпусціць у Маскву. Разам з імі вырашылі выбраць больш зямную прафесію. І я паступіла на гістфак БДУ, атрымала добрую, фундаментальную адукацыю.

А потым убачыла аб'яву пра кастынг і падумала: чаму б і не? У тым, што трапіла на тэлебачанне, ёсць і выпадковасць, і дзесьці шанцаванне, і мой характар, безумоўна. Бо я ведала: калі мяне возьмуць, прыйдзецца шмат вучыцца. Так і атрымалася. Працаваць у кадры, чытаць з суфлёра — для мяне ўсё аказалася новым і няпростым. Вельмі пашчасціла, што спачатку мяне ўзялі ў праграму «Наша раніца». Другім вядучым быў Валерый Кашчэеў. Ён прафесійны акцёр і вельмі мне дапамагаў. Прызнаюся, я вучыла свой тэкст на памяць, бо мне было складана чытаць з суфлёра. Рэагаваць трэба было і на яго, і на вядучага, і на рэплікі рэжысёра... Запіс нашай праграмы ішоў да дзвюх-трох гадзін ночы. Вось так удзень пачынала і сядзела да ночы. А раніцай праграма выходзіла ў эфір. Было няпроста, але вельмі цікава! Я жыла толькі працай. У нас на тэлеканале выдатны калектыў. Усе адзін аднаму дапамагаюць. Не сорамна прыйсці і сказаць, што ты нешта не ўмееш. Таму мне ўдалося атрымаць выдатны вопыт.

***— А ваша дзіцячая мара ў пэўным сэнсе спраўдзілася: вы здымаліся ў кіно, нават у Алега Янкоўскага ў фільме «Ідэальная жонка»...***

— Там у мяне была эпізадычная роля вядучай. У іншых фільмах таксама эпізадычныя ролі. А ў кіно трапіла наступным чынам: да нас на праграму прыходзіў рэжысёр Дзмітрый Астрахан. І папрасіў мае фотаздымкі, сказаў, што, магчыма, мы вас і запросім. Вось так перыядычна і дагэтуль запрашаюць. Але я не прафесійная актрыса, і рабіць стаўку на кіно было б няправільна.

***— Пасля нараджэння Валодзі вы вельмі хутка вярнуліся да работы...***

— Так, яму было 10 месяцаў, калі я вярнулася ў эфір. У дэкрэтны адпачынак я пайшла з праграмы «Наша раніца». І на маё месца ўзялі Люсю Лушчык. Таму я не ведала, што мне прапануюць на АНТ, калі вярнуся. І тут якраз шукалі яшчэ адну вядучую для «Нашых навін». Рыгор Леанідавіч Кісель (на той момант кіраўнік канала АНТ. — **Аўт.**) даў мне шанц паспрабаваць сябе ў ролі вядучай інфармацыйнай праграмы, за што я яму вельмі ўдзячная. І вось ужо 10 гадоў я вяду праграму «Нашы навіны».

***— Хто дапамагаў вам, калі сын быў маленькі і вы вярнуліся да работы?***

— Мае бацькі. Яны і цяпер мне дапамагаюць.

***— Якія ў вас адносіны з бацькам Валодзі?***

— Мы рассталіся, калі сыну было паўгода. Было вялікае каханне, але мы не здолелі яго захаваць. Ён паехаў у Расію, у яго там свой бізнес. Я была не гатовая пакінуць усё тут і паехаць да яго. Зараз мы з ім добрыя сябры, нам з Валодзем ён вельмі дапамагае. Праўда, лічыць, што сына я надта пешчу *(усміхаецца)*.

***— Наколькі важна для вядучай захоўваць маладосць, не мяняцца шмат гадоў, як, скажам, вядучая з першага расійскага канала Кацярына Андрэева?***

— Яна, дарэчы, наведвае і трэнажорную залу, і басейн. Спорт ёсць і ў маім жыцці. Апошнім часам займаюся ў Наталлі Наважылавай па індывідуальнай праграме. Яна і сама прыклад для многіх і для мяне — у 63 гады ў выдатнай фізічнай форме: стаіць на галаве, садзіцца на шпагат, робіць мосцік... Вельмі люблю раніцай хадзіць на аква-аэробіку. Часам магу і на прабежку ў парку выйсці, пакатацца на веласіпедзе, у басейн сходзіць. Летам нават у футбол гулялі з сынам.

***— Што трэба рабіць, каб твар заставаўся малады і прыгожы, як у вас?***

— Лічу, што мне пашчасціла з генетыкай: мая бабуля ў 90 гадоў добра выглядала. Важныя і нашы эмоцыі: калі чалавек свеціцца дабрынёй і любоўю, гэта і на твары адбіваецца. Я люблю і ўсялякія касметычныя працэдуры, наведваю касметолага. Не адмаўляюся і ад хатніх сродкаў: раблю маскі з маладой бульбы, клубніц з градкі, агуркоў. Я за любы догляд, у тым ліку і за народныя рэцэпты. Таксама для жанчыны важна высыпацца. У мяне, праўда, гэта не заўсёды атрымліваецца. Тады на дапамогу прыходзяць замарожаныя лядовыя кубікі з рамонкам ці чыстацелам.

***— Дапускаеце магчымасць з узростам больш сур'ёзнага ўмяшальніцтва?***

— Уколы з комплексам вітамінаў і калагенам, які з узростам не выпрацоўваецца, я і цяпер раблю. Гэта догляд глыбокага ўздзеяння, так званая мезатэрапія. Пра хірургічнае ўмяшальніцтва пакуль не гатовая адказаць, з маёй прафесіяй яно, канешне, можа спатрэбіцца. Але важна захоўваць меру. Усё ж я за прыгажосць натуральнае старэнне.

**Алена КРАВЕЦ.**

**«ЗВЯЗДА» — РУПЛІВЫМ ГАСПАДАРАМ!**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на II квартал або I паўгоддзе 2018 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 красавіка 2018 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 18.04.2018 г. будуць разыграны 7 набораў садовага інструменту No Brand Тарнада і суперпрыз — мінікультыватар Daewoo Power DAT 1800E. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 28.04.2018 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.06.2018 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або I паўгоддзе 2018 г. і пашпарта. Пасля 30 чэрвеня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» чытайце ў № 42 газеты «Звязда» ад 01.03.2018 г.

Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.

Тэрмін правядзення гульні — з 02.03.2018 г. па 30.06.2018 г.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3211 ад 27.02.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.



Мінікультыватар Daewoo Power DAT 1800E

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або I паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
(аддзяленне сувязі)

______ на II квартал або I паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ______

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

# ШАШКІ («ЗВЯЗДА»)

Выпуск № 59

Сёння для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя нашымі суседзямі. У шашкі-64 кампазіцыі склаў Рымас Мацкявічус (Вільнюс), а ў шашкі-100 Валерый Кручкоў (Кагарлык Кіеўскай вобл.).

**№ 15**
**Белыя простыя шашкі:** d2, d4, e1, f2, f6, g1 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** b4, b6, d6, d8, f8, h4, h8 (7)

**№15**



**№ 16**
**Белыя простыя шашкі:** a3, c1, c5, e1, g5 (5)
**Чорныя простыя шашкі:** b2, b4, d6, e7, f8, h6 (6)

**№ 17**
**Белыя простыя шашкі:** 19, 22, 23, 25, 28, 31, 33, 34 (8)
**Чорныя простыя шашкі:** 10, 11, 14, 17, 20, 26, 35, 43 (8)

**№ 18**
**Белыя простыя шашкі:** 7, 8, 11, 12, 13, 31, 41 (7)
**Чорныя простыя шашкі:** 3, 10, 16, 22, 26, 30, 38, 40 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

З 19 па 25 лютага ў Гомелі прайшло першынство Беларусі па шашках-64 сярод юнакоў і дзяўчат. Пераможцамі ў сваіх узроставых катэгорыях сталі: Любоў Кобрына, Вікторыя Нікалаева, Яна Лазовік, Аляксандра Спірына, Арцём Ціханаў, Леў Марат, Іван Трубнікаў, Міхаіл Семянюк.

З 20 па 22 красавіка ў г. Слоніме пройдуць традыцыйныя рэспубліканскія спаборніцтвы па шашках-64, прысвечаныя памяці братоў Мялешкаў і Мікалая Крата. Пацвердзіць удзел трэба не пазней за 16 красавіка па тэл. 8 029 1151830 ці па e-mail a.aniska@tut.by

Праверце свае рашэнні: выпуск № 58 ад 10.03.18.
**№ 12** ef2, e3, e7, g5, g3, b8, h8 +
**№ 13** b6, c7, c5, f4, e1+
**№ 14** 1. 3833 2720 (трэба біць большасць) 2. 4034 3. 3502 1116 4. 0211 5. 2117+

Правільныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на), Ф. Карпей (Мядзел), В. Статкевіч (п. Зялены Бор Івацэвіцкага р-на), В. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе — Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі р-н).

***Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, газета «Звязда»; e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru***

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

## Пятніца, 30 сакавіка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 1.50** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15** «Зона Х» (16+).
**9.10 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.40, 19.20 Серыял «Сямейны альбом» (12+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.40, 15.25, 17.05 Серыял «Клан ювеліраў. Тайны» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Клуб рэдактараў» (16+).
**22.30 Меладрама «Хатняя работніца» (12+).**
**2.10** «Дзень спорту».

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.45** «Тэлебарометр».
**9.05, 19.50 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.15, 17.40 Серыял «Ганна-дэтэктыў» (16+).**
**12.15** «Арол і рэшка. Юбілейны» (16+).
**13.15** «Паненка-сялянка» (16+).
**14.15** «На нажах» (16+).
**15.20 Серыял «Каварныя пакаёўкі» (16+).**
**16.15, 0.10** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20, 0.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**17.10** «Багіня шопінгу» (16+).
**21.00** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**22.00** «Спортлато 5 з 36», «КЕНО».
**22.05** «Бітва экстрасэнсаў. 15-ы сезон» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.40, 12.20** «Беларуская кухня». Велікодны куліч. Клінковы сыр.
**8.05, 12.00, 19.55** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.15 «Вечны кліч». Маст. фільм (12+).**
**9.35, 16.10** «Апошні дзень». Валерый Залатухін (12+).
**10.10** «Сіла веры».
**10.35, 16.55 «Налева ад ліфта». Камедыя (12+).**
**12.50** Рок-опера «Курган» і канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі.
**14.25, 22.15** «Выдатныя авіяканструктары». Уладзімір Мясішчаў (12+).
**15.00, 21.05 «Зваротнай дарогі няма». Маст. фільм (12+).**
**19.30** «Камертон». Народная артыстка Беларусі Святлана Акружная.
**20.10** «Тэатр у дэталях». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Шэсць танцаў».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.50** «Час кіно». Работы студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.
**23.30** Трансляцыя Хрэснага ходу з Рымскага Калізея з удзелам Папы Рымскага Францыска.

### Беларусь 5

**7.10** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. Фінал. Першы матч.
**9.15** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Другі матч.
**11.10** Кікнадзэ. Меркаванне.
**11.40** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. 77 кг. Фінал.
**13.30** Авертайм.
**14.00** Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
**14.35** Спорт-мікс.
**14.45, 19.35** Тэніс. Турнір WTA. Маямі. 1/2 фіналу.
**16.55** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. Фінал. Першы матч. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**19.25** Спорт-цэнтр.
**21.35** Хакей для ўсіх.
**22.10** Змешаныя адзінаборствы. UFC.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Ідэальны рамонт» (12+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Лепш за ўсіх!» (6+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Поле цудаў» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10** «Удача ў прыдачу!» Дзённік. Спецвыпуск (12+).
**21.15** «Голас. Дзеці». Новы сезон (6+).
**23.00** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Вясновая серыя гульняў (16+).
**0.20** «Вячэрні Ургант» (16+).
**1.15** «Начныя навіны».

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30 «NEXT». Серыял. Заключная серыя (16+).**
**9.20** «Спецыяльны рэпартаж СТБ».
**9.40, 0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Следакі» (16+).
**11.05, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.55, 17.55 «Гульні ў падкіднога». Серыял (16+).**
**13.45 «Стралок-2». Серыял (16+).**
**15.20** «Ежа багоў» (16+).
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50** «Скардзіцца дазваляецца» (16+).
**17.10** «Далёкія сваякі» (16+).
**17.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**17.50, 21.40** Дакументальны спецпраект (16+).
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы». (12+).**
**23.05 «Стралок-3». Серыял (16+).**
**1.35 «NEXT-2». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**6.15, 8.05, 10.05, 13.15 Серыял «Лекі супраць страху». (16+).**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 1.00** Навіны (бягучы радок).
**14.00** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**17.15, 19.10 Серыял «Мінус адзін». 1—4-я серыі (16+).**
**21.05 Маст. фільм «Патрабуецца няня» (16+).**
**23.15 Маст. фільм «Асліная шкура» (12+).**
**1.20** «Трымайся, шоубіз!» (16+).
**1.50** «Дастукацца да зоркі» (12+).
**2.20 Маст. фільм «У пачатку слаўных спраў» (16+).**
**5.00** «Любімыя акцёры». Мікалай Яроменка (12+).
**5.30** М/ф (6+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым (12+).
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 20.40 Серыял «Адно жыццё на дваіх» (16+).**
**13.25** «Пакой смеху» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека» (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40, 23.10** Юбілейны вечар Уладзіміра Вінакура (16+).
**0.00 Серыял «Каменская» (16+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**7.50, 8.10 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50 Серыял «Сужэнцы» (16+).**
**9.40, 23.15** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных» (16+).
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Прадчуванне» (16+).**
**16.35, 19.45 Серыял «Берагавая ахова» (16+).**
**19.40** «НЗ. Расследаванне» (16+).
**21.15 Серыял «Шуберт» (16+).**
**23.45** «Таямнічая Расія» (16+).

### 8 канал

**7.00, 16.00, 19.35, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.30, 23.10 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**8.20 Серыял «Макс» (12+).**
**9.10, 19.40 Серыял «Які малюе вецер» (12+).**
**10.10** «Здароўе».
**11.00 Трылер «Окулус» (16+).**
**13.00 Серыял «Палюбоўнікі пустыні» (16+).**
**14.30 Меладрама «Гром нябесны» (12+).**
**16.05** Для дзяцей «Адказвайка» (0+).
**16.10** «Мультпарад».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**17.15 Серыял «Анёлы» (16+).**
**18.45 Серыял «Абаронца» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05 Трылер «Дэтэктыў Буліт» (16+).**

### ВТБ

**6.00, 16.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20. 4.20** М/ф «Джынглікі». (0+)
**7.50, 4.35** М/ф «Марын і яго сябры». (0+)
**8.10, 4.50** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.30** «Ералаш». (6+)
**9.20, 2.00** Серыял «Гэта каханне». (16+).
**10.20** Камедыя «Такія розныя блізняты». (12+).
**12.20, 3.40** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**13.00, 2.50** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**14.00, 20.00** «Супермамачка». (16+).
**15.10, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50** «Уральскія пельмені». (16+).
**19.00** Серыял «Івановы-Івановы-2». (16+).
**21.10** Камедыя «Усё або нічога». (16+).
**23.20** Жахі «Гарадскія легенды». (16+).
**1.10** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.10** Навіны культуры.
**6.35** «Легенды сусветнага кіно». Уладзімір Зельдзін.
**7.05** «Пешшу...» Масква бронзавая.
**7.35** «Правілы жыцця».
**8.05** «Мае ўніверсітэты». Маст. фільм.
**9.40, 19.45** «Галоўная роля».
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Лётчыкі». Маст. фільм.
**11.55** «Цвінгер. Па следзе дрэздэнскіх шэдэўраў». Дак. фільм.
**12.40** «Энігма. Марыс Янсанс».
**13.20** Сусветныя скарбы.
**13.35** «Людзі і камяні эпохі неаліту». Дак. фільм.
**14.30** «Неяўклідава геаметрыя Сяргея Бархіна». Дак. фільм.
**15.10** Аляксандр Таро. Клавірныя санаты Даменіка Скарлаці.
**16.00** «Лісты з правінцыі». Уржум (Кіраўская вобласць).
**16.30** «Ісаак Штокбант. Байкі пра каханне». Дак. фільм.
**16.55** «Інтэрнэт палкоўніка Кітова». Дак. фільм.
**17.40** «Справа №. Аляксандр Радзішчаў: кніжная справа». Дак. серыял.
**18.05** «Развітанне славянкі». Маст. фільм.
**19.45** Смеханастальгія.
**20.15** «Лінія жыцця». Сямён Альтаў.
**21.10** Кіно на ўсе часы. «BLOWUP» ( «Фотапавелічэнне»). Маст. фільм.
**23.30** «2 Вернік 2».
**0.20** Асобы погляд. «Дыпан». Маст. фільм.
**2.20** «Вельмі сіняя барада». «Мена». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**7.00, 13.25, 19.25, 1.10** Маст. фільм «Цыган». (16+).
**8.10, 9.40, 11.00, 13.10, 14.45, 15.40, 18.00, 20.45, 21.40, 23.00, 0.50, 2.50, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. В. Цой. «Дзеці хвілін». 2-я частка: «Радавацца трэба!» 2008 год (16+).
**17.05** «Шынок «13 крэслаў». 1970 год (12+).
**18.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1979. 1-я частка. 2009 год (16+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Яны былі вязнымі». 2007 год (16+).

### EuroSport 1

**2.30** Watts. Топ-10.
**3.00, 6.30, 12.00, 15.00, 22.15** Футбол. «ФІФА».
**3.30, 7.00, 12.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**4.00, 7.30, 9.30, 15.30, 18.00, 20.30, 0.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы.
**8.30, 13.30** Веласпорт. «Тур па дарогах Фландрыі».
**13.00** Ралі. ERC. All Access.
**22.45** Снукер. The Players Championship. Фінал.

### Кінакамедыя

**1.00** Тупы і яшчэ тупейшы-2. (16+).
**3.05** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**3.45** Імя. (16+).
**5.50** Вундэркінды. (16+).
**7.55** 1 + 1. (16+).
**10.00** Даю год. (16+).
**11.55** Мігатлівыя агні. (16+).
**14.00** Анёлы Чарлі. (12+).
**15.50** Анёлы Чарлі-2: толькі наперад. (12+).
**17.45** Ушчэнт. (16+).
**19.30** Чацвёра супраць банка. (16+).
**21.15** Сем кабінак. (18+).
**23.10** Дрэнны Санта. (16+).



### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.05** «Доктар І...» (16+).
**8.35** «Асколкі». Серыял (16+).
**10.20, 3.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.00** «Сакрэты экстрасэнсаў» (16+).
**12.55, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**13.55, 5.05** «Паралельны свет» (12+).
**14.55** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.30** «Простыя складанасці» (12+).
**16.05** «Мой герой» (12+).
**18.05, 1.50** «Дзённік экстрасэнса» (12+).
**19.10, 2.40** «Чалавек-невідзімка».
**20.15** «Двое — гэта занадта». Камедыя (12+).



**22.30** «Дарагі Джон». Драма (16+).
**0.25** «Лекі ад старасці». Дак. фільм (16+).

### ТБ1000

**6.10, 18.00** Пітэр Пэн. (12+).
**8.20** Каралеўства поўнага месяца. (12+).
**10.10** Таксі-4. (12+).
**11.55** Мацільда. (0+).
**13.50** Спявак на вяселлі. (12+).
**15.45** Усмешка Моны Лізы. (12+).
**20.10** Дзікая рака. (12+).
**22.15** Жорсткія гульні. (16+).
**0.10** Бачнасць гневу. (16+).
**2.30** Ірацыянальны чалавек. (18+).
**4.15** Марс атакуе! (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Мяцеліца (16+).
**8.05** Уцякачкі (12+).
**10.05** Буду памятаць (16+).
**12.05** Іван Царэвіч і Шэры Воўк (12+).
**13.45** Чатыры таксісты і сабака-2 (12+).
**16.20, 4.20** Тата напракат (12+).
**18.25** Сухадол (16+).
**20.20** Рэальны тата (12+).
**22.10** Увесь гэты джэм (16+).
**0.05** Мафія: гульня на выжыванне (16+).
**1.50** Дзень выбараў (16+).

### National Geographic

**6.00** Інжынерныя ідэі. (12+).
**6.50** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.40, 13.20** Неверагодны доктар Пол. (16+).
**8.30, 11.45, 16.25, 20.20** Аўта-SOS. (12+).
**9.15, 15.35, 19.35, 0.15, 2.40** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**10.05, 14.05** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**10.55** Найцяжэйшы ў свеце рамонт. (6+).
**12.30, 14.50, 22.45** Невядомая планета Зямля. (12+).
**18.00, 22.00, 1.05, 4.20** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны. (12+).
**18.50** Зорная размова. (16+).
**23.30** Уварванне на Зямлю. (16+).
**1.55** Фідэль Кастра: страчаныя плёнкі. (16+).
**5.10** Паранармальнае. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары.
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена?
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады.
**11.00** Адраджэнне металалому.
**14.00, 7.10** Выжыць любой цаной.
**18.00, 20.00, 1.00** Залатая ліхаманка.
**19.00, 5.30** У пагоні за класікай.
**0.00** Загадкі планеты Зямля.
**2.00** Зроблена з другаснай сыравіны.
**2.55** Маланкавыя катастрофы.

ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ДЫСКУСІЯ

# ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ ЖЫЦЦЁ ЗА МКАД

## Год малой радзімы — добрая нагода, каб адрадзіць беларускую глыбінку

**«Міжрэгіянальнае расслаенне ўнутры краіны становіцца ўстойлівым працэсам», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка 2 сакавіка ў Мінску на пасяджэнні, прысвечаным справаздачы ўрада, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама аб выніках працы эканомікі за 2017 год і задачах па забеспячэнні ўстойлівага эканамічнага росту.**



Не навіна, што рэгіёны развіваюцца нераўнамерна, а асноўны людскі ды фінансавы капітал сканцэнтраваны ў сталіцы. Лес рук, які ўзняўся ў адказ на пытанне «Хто тут не з Мінска?» падчас інтэрактыўнай дыскусіі «Як ажывіць беларускія рэгіёны», яшчэ раз наглядна паказаў, што сталіца сапраўды «высмоктвае» людскі капітал з вёсак і малых гарадоў. Так складвалася дзесяцігоддзямі, а на сённяшні момант сітуацыя дасягнула такіх маштабаў, што вёскі выміраюць, а жыхары многіх малых гарадоў вымушаны працаваць у сталіцы. Чаму так адбылося і што трэба неадкладна зрабіць для паляпшэння сітуацыі, разважалі эксперты падчас згаданай сустрэчы, арганізаванай грамадскім аб'яднаннем «Дыскусійна-аналітычная супольнасць «Ліберальны клуб».

### Што адбываецца?

Па-першае, у рэгіёнах складаная дэмаграфічная сітуацыя. У той час як вялікія гарады раслі, вёскі і малыя гарады страчвалі насельніцтва. Паводле даных Міністэрства эканомікі, да 2032 года 77 са 118 раёнаў Беларусі не будуць мець устойлівай колькасці жыхароў (гэта значыць, што ў іх будзе жыць менш за 20 тысяч чалавек). Буйныя гарады, перш за ўсё Мінск, перацягваюць маладзейшых і часта — найбольш здольных. Розніца ва ўзросце добра відаць на прыкладзе каэфіцыента смяротнасці: у 2015 годзе на тысячу жыхароў у Мінску прыпадала 8,8 смерці, а па ўсёй Беларусі — 13,6.

Па-другое, рэгіёны губляюць працоўныя рэсурсы. Пачынаючы з 2012 года сельскае насельніцтва штогод стабільна скарачаецца на 1 %. Колькасць працаздольных у райцэнтрах зменшылася на 3 % за перыяд з 2014 г. Гэта прыводзіць да фарміравання кластараў так званых дэпрэсіўных рэгіёнаў, у якіх няма каму працаваць.

Па-трэцяе, назіраецца дысбаланс у аплаце працы. Паводле даных за перыяд з 2003 па 2016 гады, сярэдні заробак па краіне адрозніваецца ад заробку ў райцэнтрах прыкладна на 20 %.

Па-чацвёртае, у рэгіёнах ніжэйшы ўзровень сацыяльнага развіцця. Гэта добра відаць па колькасці ВНУ за межамі Мінска. Калі ў Мінску іх 28, то ў Магілёўскай вобласці — 5, у Гродзенскай — 3, у Гомельскай — 6, у Віцебскай — 5, у Брэсцкай — 4.

Па-пятае, у рэгіёнаў, на думку экспертаў, недастаткова самастойнасці, пачынаючы ад размеркавання падаткаў і завяршаючы не вельмі развітым мясцовым самакіраваннем. Дададзім да гэтага ўтрыманскі настрой пэўнай часткі людзей, якія нічога не хочуць мяняць у сваім жыцці. Бо для таго каб навесці парадак на ўласным падворку, не трэба чакаць аб'явы пра суботнік.

> Апошнім часам у краіне назіраецца выразны рух у кірунку канкрэтнага вырашэння наспелых праблем. Улада на практыцы адыходзіць ад залішняга рэгулявання эканомікі і яе складнікаў, ад мноства забарон і абмежаванняў.

З меркаваннямі экспертаў пагаджаецца і **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Леанід БРЫЧ:** «Калі ў сталіцы і абласных цэнтрах становішча пакрысе паляпшаецца — актывізуецца бізнес, ствараюцца невялікія мабільныя прадпрыемствы, паступова расце заробак, праяўляюцца некаторыя іншыя станоўчыя тэндэнцыі, дык у рэгіёнах гэта пакуль не вельмі адчуваецца. З-за адсутнасці працы не змяншаецца міграцыя ў гарады кваліфікаваных спецыялістаў. А выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў не хочуць вяртацца на малую радзіму».

### Рабіць стаўку на бізнес

На думку экспертаў, найперш нашым рэгіёнам патрэбна моцнае мясцовае самакіраванне. Як расказаў Леанід Брыч, не першы год вядзецца гаворка пра тое, што рэгіёнам трэба даць больш самастойнасці. «Мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя камітэты павінны вызначаць галоўныя кірункі развіцця сваіх тэрыторый, фарміраваць падатковую базу і сістэму першачарговага выкарыстання заробленых грошай. Адначасова яны павінны адказваць за вынікі сваёй дзейнасці не толькі перад вышэйшым кіраўніцтвам, але і перад насельніцтвам, — кажа парламентарый. — Думаецца, гэта прымусіць мясцовых кіраўнікоў, як і патрабуе Прэзідэнт краіны, больш клапаціцца менавіта пра надзённыя справы і праблемы людзей, развіццё эканомікі, пра выпрацоўку і прыняцце такіх рашэнняў, якія будуць дапамагаць суб'ектам гаспадарання, а не перашкаджаць іх працы, па фармальных прыкметах або з-за нязначных парушэнняў стрымліваючы праяўленне ініцыятывы і прадпрымальнасці».

Для паляпшэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэгіёнах эксперты прапануюць выкарыстаць у тым ліку і вопыт іншых краін, які датычыцца дэцэнтралізацыі. У прыклад яны ставяць Германію, дзе Цэнтрабанк знаходзіцца ў Франкфурце-на-Майне, а не ў Боне. А ў Чэхіі ўсе суды высокіх інстанцый вынесены за межы Прагі. І такая практыка існуе ў многіх краінах Еўропы.

Навуковы супрацоўнік Цэнтра эканамічных даследаванняў BEROC Алег Мозаль упэўнены, што рэгіёны ўратуе прадпрымальніцтва. У прыватнасці, сямейны бізнес, у якім спалучаюцца, напрыклад, класічная сельская гаспадарка і IT-тэхналогіі. На практыцы гэта выглядае такім чынам: дробныя вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі кааперуюцца і ажыццяўляюць пастаўкі ў буйныя гандлёвыя сеткі, выкарыстоўваючы мабільную праграму.

Леанід Брыч таксама лічыць, што ў рэгіёнах галоўную стаўку трэба рабіць на малы бізнес, бо ён больш мабільны, манеўраны, здольны хутка ствараць новыя рабочыя месцы і выкарыстоўваць мясцовыя рэсурсы.

«Пэўны ўплыў на становішча спраў у правінцыі, як падаецца, зробіць аб'яўленне бягучага года Годам малой радзімы, — кажа парламентарый. — Хочацца верыць, што з гэтай нагоды не адзін бізнесмен успомніць пра тыя мясціны, дзе нарадзіўся і вырас, і — па прыкладзе славутых родаў мінулага — пастараецца пакінуць сваё імя ў гісторыі роднай зямлі шляхам укладання сродкаў у яе развіццё і працяг жыцця. Апошнім часам у краіне назіраецца выразны рух у кірунку канкрэтнага вырашэння наспелых праблем. Улада на практыцы адыходзіць ад залішняга рэгулявання эканомікі і яе складнікаў, ад мноства забарон і абмежаванняў. І гэта стала добрым знакам як для вытворцаў, бізнесменаў, так і для айчынных і замежных інвестараў. Значыць, павінны быць і станоўчыя вынікі».

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

МЕРКАВАННІ

# Па працу — у вёску

**Сітуацыя незвычайная. Прывыклі да супрацьлеглага — людзі ў пошуках працы пакідаюць вёску і едуць у горад. Калі паглядзець на гэту праблему з іншага боку, можна заўважыць: перспектыўную працу на выдатных умовах гарадскі чалавек можа знайсці і ў вёсцы. Мы запыталі ў нашых чытачоў, ці змянілі б яны месца жыхарства дзеля працы?**

**Наталля МАЗЫНСКАЯ, старшыня Жодзінскага сельскага Савета дэпутатаў:**

— Я вельмі падтрымліваю гэтую ідэю. Я за тое, каб моладзь вярталася ў вёску, людзі замацоўваліся ў пасёлках, мястэчкі ажывалі. Вёскі нашага сельсавета размяшчаюцца вакол Жодзіна. Многія людзі, асабліва з аграгарадкоў Барсукі і Бадагова, працуюць у горадзе. У нас ёсць буйны індустрыяльны аграпрамысловы комплекс «ЖодзінаАграПлемЭліта», створаны Навукова-практычным цэнтрам па жывёлагадоўлі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У іх шмат новых аўтаматызаваных прадпрыемстваў: і фермы, і свінагадоўчыя гаспадаркі. Тым патрэбны спецыялісты, якія могуць працаваць з новымі камп'ютарызаванымі сістэмамі. Зараз прадпрыемства будуе дамы для сваіх спецыялістаў. Моладзь прыязджае і застаецца працаваць у сельскай мясцовасці. Згадзіцеся, маладой сям'і цяжка адразу купіць дом ці кватэру, таму ў першую чаргу іх прыцягвае вырашэнне жыллёвага пытання.

**Марыя АЛЕЙНІК, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Любанскага раённага выканаўчага камітэта:**

— Зараз мы займаемся перасяленнем двух бабруйчан у вёску Асавец. Там новыя жыхары будуць працаваць спецыялістамі — ветэрынарным урачом і заатэхнікам. Яны загадзя прыязджаюць, сустракаюцца з кіраўніцтвам гаспадаркі, вырашаюць усе пытанні з уладкаваннем.

Унутры раёна таксама ёсць перасяленні, але іх значна менш, чым раней, бо ёсць працоўныя месцы і людзей усё задавальняе. У мінулым годзе да нас прыехала сям'я з Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці. Жанчына працуе загадчыцай фермы, а яе муж — трактарыстам. Усім, хто перасяляецца, мы даём жыллё. Узрост новых жыхароў нашага раёна — да 40 гадоў. Гэта тая ўзроставая катэгорыя, калі людзі яшчэ маюць смеласць «сарвацца» з прывычнага месца жыхарства. Апошнія гады заўважная станоўчая тэндэнцыя: людзі не пакідаюць раён, а прыязджаюць да нас. Калі б перада мной стаяла пытанне, ці скарыстацца такой магчымасцю, я згадзілася б: лічу, што сёння мабільнасць вельмі неабходная.

**Дар'я СПЯЦАНАВА, намеснік старшыні прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ:**

— На мой погляд, усё залежыць ад каштоўнасцяў пэўнага чалавека. Калі для яго на першым месцы не кар'ера і ён хоча больш часу займацца сваёй сям'ёй, мне здаецца, можна жыць і не ў вялікім горадзе. Я заўважаю, што ў моладзі цяпер ёсць тэндэнцыя пераязджаць у вёску. Многія хочуць мець свой уласны домік, быць бліжэй да прыроды. На мой погляд, вельмі важна ствараць умовы для пераезду на працу ў невялікі населены пункт. Калі ёсць добрая вакансія і даюць жыллё, чаму не? Канешне, у вялікім горадзе больш шанцаў для самарэалізацыі, уладкавання дзяцей у гурткі, секцыі. Але сёння такія магчымасці ёсць і ў невялікіх гарадках, і ў пасёлках.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# НЕРЭНТАБЕЛЬНЫ КАЛОДЗЕЖ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»).*

Дарэчы, як паведамілі ў бухгалтэрыі Мсціслаўскага «Водаканала», насельніцтва пакрывае страты арганізацыі па абслугоўванні калодзежаў толькі на 15 %.

— Бясплатнай вада для насельніцтва можа стаць толькі ў тым выпадку, калі ў новым законе аб пітным водазабеспячэнні гэта будзе выразна прапісана, — кажуць спецыялісты.

У Глускім раёне насельніцтва за калодзежную ваду наогул не плаціць. Усе расходы на сябе бярэ мясцовы «Жылкамгас».

— Калодзежы, якія запатрабаваны, падтрымліваюцца ў належным стане, але шмат сродкаў ідзе на іх эксплуатацыю, бо нам трэба не толькі даглядаць гэтыя аб'екты, але яшчэ і плаціць за аналіз вады, які праводзіцца санстанцыяй штомесячна, — кажа **дырэктар прадпрыемства Юрый ДЫМША.**

І з гэтым не паспрачаешся. Ёсць пагроза, што ў калодзеж могуць трапіць арганічныя забруджванні, якія потым пераўтворацца ў нітраты. Як вядома, у высокай канцэнтрацыі яны прадстаўляюць пагрозу для здароўя чалавека. Дарэчы, зусім нядаўна ў краіне быў выпадак, калі маці накарміла дзіця сумессю, зробленай на крынічнай вадзе, пасля чаго малое ледзь выратавалі ў бальніцы.

## Плаціць або не плаціць

Спецыялісты кажуць: блытаніна адбылася таму, што ў існуючым законе аб пітным водазабеспячэнні выразна агаворваецца платнасць вады, а ў паднарматыўных актах Мінжылкамгаса калодзежы адносяцца да аб'ектаў добраўпарадкавання, а значыць плата за карыстанне імі не прадугледжана. Адсюль, маўляў, і ўсе праблемы.

— На студзень у камунальнай маёмасці вобласці налічвалася 10 664 шахтавыя калодзежы, з іх цалкам адрамантаваная дзесьці 10-я частка (або 1100). На абслугоўванне аднаго калодзежа патрэбна прыкладна 330 рублёў. Але сродкаў не хапае, бо яны выдзяляюцца толькі на абслугоўванне сістэм цэнтралізаванага водазабеспячэння. У выніку прыкладна на 62 % нашы арганізацыі працуюць сабе на страту. Але адмовіцца ад шахтавых калодзежаў нельга, дзесьці яны выкарыстоўваюцца для тэхнічных і іншых патрэб. Калі ў новым законе будзе прапісана — лічыць калодзежную ваду бясплатнай, мы зможам абгрунтаваць свае выдаткі перад фінансавымі органамі, — паведаміў **начальнік аддзела ЖКГ Магілёўскай вобласці Андрэй НЕСЦЕРАЎ.**



## На балансе сельвыканкамаў

Абслугоўваннем калодзежаў раней займаліся выключна сельвыканкамы, але было прынята рашэнне перадаць іх водаканалам. Асіповіцкі раён быў адным з першых.

— Асноўную частку перадавалі ў камунальную маёмасць, а там, дзе імі мала хто карыстаўся, у асабістую маёмасць грамадзян, — прыгадаў той перыяд **былы старшыня Асіповіцкага райсавета дэпутатаў Аляксандр ПУЗІК.** — Для Водаканала галоўная праблема ў тым, што вада застойваецца, калі яе не выбіраюць, яе трэба адпампоўваць, шмат клопатаў. Таму мы іх Водаканалу і не аддавалі. А жыхары былі не супраць такой маёмасці.

Камунальнікі лічаць такую пазіцыю правільнай. Калі на вёсцы адзін-два чалавекі, то гэта найлепшае выйсце. Чалавек будзе сам даглядаць калодзеж і прымаць меры па яго ачыстцы. Да таго ж пры перадачы гэтых аб'ектаў у камунальную маёмасць узнікалі непаразуменні, калі людзі скардзіліся, што гэта іх прыватная маёмасць, а не грамадская.

Сёння на балансе сельвыканкамаў у Магілёўскай вобласці засталіся калодзежы толькі ў Бабруйскім і часткова ў Бялыніцкім раёнах.

— У нас на балансе 65 калодзежаў, — кажа **старшыня Глушанскага сельскага Савета Марыя СУШЧАНКА.** — Чысцім іх гаспадарчым спосабам, але яго нельга назваць кваліфікаваным. Сёння існуюць вельмі высокія патрабаванні да правілаў ачысткі. У Жылкамгасах ёсць і адмысловае абсталяванне, і спецыяльна падрыхтаваныя спецыялісты. А мы проста дылетанты. Мы згодны хоць сёння перадаць гэтую маёмасць. Тым больш што ніякіх цяжкасцяў тут няма. Пад калодзежы не трэба рабіць тэхнічныя пашпарты і ўстанаўліваць межы ўчастка. Яны перадаюцца на падставе рэгістрацыйнай карткі. Рашэнне Бабруйскага райвыканкама аб перадачы прынята, спадзяёмся, што яно будзе выканана.

— На тэрыторыі раёна каля 300 калодзежаў, — удакладніў **намеснік старшыні Бабруйскага райвыканкама Сяргей ЛЯПІЧАЎ.** — Колькі з іх у нездавальняючым стане, зараз высвятляецца. Ідуць абследаванні, складаюцца акты. Калі яны будуць у парадку, мы іх прымем. Пакуль магу сказаць толькі адно: прыбытку яны не прынясуць.

— Зараз ідзе працэдура перадачы гэтых аб'ектаў на баланс мясцовага ЖКГ, — акрэсліў становішча вакол калодзежаў у Бялыніцкім раёне **старшыня райсавета дэпутатаў Андрэй ГАНЧУК.** — Перад тым як іх перадаць, прыводзім у належны выгляд. Робіцца гэта талакой, дзе за кошт насельніцтва, а дзе за кошт арганізацый, якія замацаваны на той жа тэрыторыі.

**Нехта лічыць, што наогул прыйшла пара адмовіцца ад калодзежаў і цалкам пераходзіць на цэнтралізаванае водазабеспячэнне. Навошта нам, маўляў, гэты галаўны боль? Але на месцах так не думаюць.**

— Адмовіцца ад шахтавых калодзежаў цалкам пакуль немагчыма, — кажа Андрэй Ганчук. — Ёсць населеныя пункты, дзе наогул няма цэнтралізаванага водаправода. Гэта маланаселеныя вёскі, і калодзежы там трэба падтрымліваць, пакольку іншых крыніц пітной вады няма. А вось парадак з яе спажываннем навесці неабходна. Бо сустракаюцца выпадкі, калі насельніцтва спекулюе на калодзежнай вадзе. За цэнтралізаванае водазабеспячэнне трэба плаціць па прыборах, а ў калодзежы гэты працэс не пракантралюеш. Знаходзяцца хітруны, якія закідваюць туды электрычныя насосы і паліваюць свае агароды. За ваду яны не плацяць, а калодзежы патрабуюць абслугоўваць. І такое часта здараецца ў населеных пунктах, дзе ёсць цэнтралізаванае водазабеспячэнне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Извещение о повторном аукционе 6 апреля 2018 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями» | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-46622 «Здание компрессорной с ремонтно-механическим участком, цех доборных изделий |
|---|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 | 3 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11У |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Отдельно стоящее |
| Общая площадь (кв. м) | 3982,2 | 3482,1 | 1930,1 |
| Площадь земельного участка для обслуживания строения (га) | 1,444 | | 0,3941 |
| Начальная цена продажи | 147 734,93 | 66 546,46 | 341 298,70 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка | 14 773,49 | 6 654,65 | 34 129,87 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв. м), решение об отводе земельного участка | Одноэтажное, состоит из 3 пролетов площадью 3982,2 кв. м. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередачи – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 кв. м. Ввод в эксплуатацию – 1973 г. | Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередачи). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г. | Одноэтажное. Состоит: здание компрессорной – 306 кв. м, помещение ремонтно-механического участка – 294 кв. м, помещение цеха доборных изделий – 1456 кв. м, пристройка – 12 кв. м, навес – 24 кв. м, градирня – 33 кв. м, два теневых навеса 7 кв. м. Покрытие бетонное – 1030 кв. м. Ввод в эксплуатацию – 1970 г. |

| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58323 «Помещение арматурного цеха» | Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-58322 «Помещение формовочного цеха с эстакадой для принятия бетона» | Комплекс зданий и сооружений (помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центром с инвентарным номером 130D-58321; склад готовой продукции с инвентарным номером 130/С-44660; очистные сооружения с инвентарным номером 130С-44951; комплект гаражей с инвентарным номером 130/С-44658; железнодорожный путь с инвентарным номером 130/С-44660) |
|---|---|---|---|
| Номер лота | 4 | 5 | 6 |
| Местонахождение объекта | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-3 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-2 | г. Пинск, ул. Калиновского, 11/1-1 |
| Тип помещения | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением | Совмещенное с другим изолированным помещением |
| Общая площадь (кв. м) | 3200,6 | 1944,40 | |
| Начальная цена продажи, рублей | 179 251,30 | 117 264,27 | 653 256,72 |
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены | 5 % от начальной цены |
| Сумма задатка, рублей | 17 925,13 | 11 726,43 | 65 325,67 |
| Условия продажи | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством | Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством |
| Сведения об объекте | Одноэтажное, состоит из 1 пролета. Длина – 131,84 п. м, ширина – 24,27 п. м;<br>Крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы – бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | Одноэтажное, состоит из 1 пролета. Длина –131,9 п. м, ширина – 17,87 п. м;<br>Крыша (кровля) – рулонные кровельные материалы; полы: бетон; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г. | – помещение формовочного цеха, арматурного цеха с бетоносмесительным центром: площадь – 18836,2 кв. м, в том числе здание арматурного цеха – 4230 кв. м, бетоносмесительный центр – 206 кв. м; крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>Ввод в эксплуатацию – 1970 г.<br>– склад готовой продукции: площадь – 14347 кв. м, 4 пролета, (материал покрытия площадки: цементобетон, колонны железобетонные с металлическим каркасом). Ввод в эксплуатацию – 1973 г.<br>– здание очистных сооружений: площадь – 205 кв. м, крыша (кровля): рулонные кровельные материалы; полы: бетон; централизованная система холодного водоснабжения и канализации; вентиляция с естественным побуждением.<br>– 2 (два) резервуара для воды: материал – бетон; наружная площадь – 108 кв. м; объем – 300 куб. м. Ввод в эксплуатацию –1994 г.<br>– комплект гаражей: площадь – 66,8 кв. м, одноэтажное, крыша (кровля): рулонная битумная; полы: бетон; вентиляция естественная. Ввод в эксплуатацию – 2010 г.;<br>– железнодорожный путь: протяженность – 3981,7 м. Ввод в эксплуатацию – 1971 г. |

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |
| Продавец аукциона | Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут» |

Аукцион состоится **6 апреля 2018 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, в актовом зале ОАО «ПКСИ».

**Перечень необходимых документов:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинским комбинатом строительной индустрии».
2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет BY16BAPB30124701200210000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – по 5 апреля 2018 г. включительно.
3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;
4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов;
5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 5 апреля 2018 года включительно, тел. 8 0165 37-16-19, тел. факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон 375 29 640-80-37**

ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

# ШАНЦЫ ДЛЯ ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

## Як бязвізавы рэжым і маштабныя інвестпраекты пашыраюць рынак працы ў Гродзенскай вобласці

**З кожным годам колькасць вакансій на Гродзеншчыне расце. Калі год таму на 5,5 тысячы свабодных месцаў прыходзілася 4,2 тысячы зарэгістраваных беспрацоўных, то на пачатак гэтага года сітуацыя рэзка змянілася. Сёння наймальнікі заяўляюць аб наяўнасці каля 8 тысяч вакантных месцаў на 2,8 тысячы беспрацоўных. Разам з тым праблему недахопу кадраў пагаршае праблема іх якасці — на рынку чакаюць кваліфікаваных спецыялістаў. Гэта асабліва актуальна ва ўмовах бязвізавай рэальнасці і ўнікальных вытворчасцяў, якія рэалізуюцца ў рэгіёне.**



### Усё для турыстаў

Другі год на тэрыторыі вобласці дзейнічае бязвізавы рэжым. З 2018-га зона яго дзеяння пашырылася — разам з паркам «Аўгустоўскі канал» і горадам Гродна сюды ўвайшоў увесь Гродзенскі раён. Павялічыўся і тэрмін знаходжання — з пяці да дзесяці дзён. Магчымасцю пабываць у старажытным Гродне і яго наваколлі актыўна карыстаюцца замежныя турысты. За час дзеяння «бязвізу» рэгіён наведалі каля 60 тысяч чалавек. Найбольш прывабным бязвізавы ўезд стаў для літоўцаў. Асабліва часта турысты-суседзі прыязджаюць на выхадныя. Нямала наведвае бязвізавую зону і палякаў, латышоў, немцаў, прадстаўнікоў іншых краін.

У аддзеле спорту і турызму гарвыканкама расказалі, што з увядзеннем бязвізавага рэжыму стаў развівацца пазнавальны, медыцынскі, падзейны турызм. Гэта, у сваю чаргу, актывізавала малы і сярэдні бізнес. Пашырылася прапанова па продажы сувенірнай прадукцыі, правядзенні касцюміраваных экскурсій, арганізацыі рэйсаў па Аўгустоўскім канале.

За час дзеяння «бязвізу» ў Гродне створана 420 новых працоўных месцаў. Пераважная большасць з іх — 307 — у сферы гандлю, 64 — у сферы грамадскага харчавання і паслуг пражывання. Таксама з'явілася каля 50 новых пасад у работнікаў культуры — для арганізацыі творчасці, забаў, адпачынку. Больш плённа пачала развівацца турыстычная індустрыя. Пабудаваны новыя хостэлы і гатэлі. Сёлета плануецца ўвесці ў дзеянне яшчэ тры гасцініцы. У Гродне ўпершыню адкрыта дзевяць стацыянарных аб'ектаў грамадскага харчавання на 360 месцаў.

### Што выявіў кастынг?

Менш чым за год у абласным цэнтры пачалі дзейнічаць адразу некалькі хостэлаў. «Стары мост» — адзін з іх. Яго гаспадыня Юлія ўжо прызвычаілася прымаць замежных турыстаў, хоць дабрацца да яе катэджа не вельмі лёгка — гарадскі транспарт паблізу не ходзіць. Таму турысты з вакзалаў часцей накіроўваюцца ў тыя месцы пражывання, якія знаходзяцца побач. Але Юлія аб сваім кірунку дзейнасці не шкадуе і лічыць яго перспектыўным. Мінулы сезон паказаў, што попыт на такія паслугі ёсць, прыязджаюць турысты з Расіі, Літвы, Польшчы. Хостэл можа прыняць да 60 пастаяльцаў, ёсць свае ўтульныя кафэ і бар. Агульны штат супрацоўнікаў — каля дзесяці чалавек.



Калектыў у асноўным жаночы. Больш за ўсё было прэтэндэнтаў на пасаду адміністратара. У кастынгу прымалі ўдзел мужчыны і жанчыны рознага ўзросту — ад 20 да 60 гадоў. Выбралі маладую жанчыну з вышэйшай аграрнай адукацыяй — яна больш за іншых спадабалася гаспадарам, бо праявіла зацікаўленасць, камунікабельнасць і не нервавалася. Але першае ўражанне — гэта яшчэ не ўсё. Кандыдат праходзіць выпрабавальны тэрмін, а наймальнік тэлефануе на папярэднія месца працы, каб атрымаць характарыстыку. Па словах Юліі, некаторыя прэтэндэнты самі не прыходзяць на гутарку, бо знаходзяць іншыя варыянты. Нядаўна з'явілася вакансія бармена. Дарэчы, гэта прафесія — з ліку запатрабаваных сярод наймальнікаў. Бармен, повар, афіцыянт маюць добрыя шанцы знайсці ў Гродне працу. Гэта звязана яшчэ і з тым, што дзякуючы бязвізаваму рэжыму павялічваецца колькасць аб'ектаў грамадскага харчавання і сферы паслуг.

### Голад на кадры

Некаторыя аб'екты сутыкнуліся з праблемай кадраў. Недахоп кваліфікаваных спецыялістаў адчулі і ўладальнікі рэстарана «Бакст», што адкрыўся нядаўна ў цэнтры Гродна. Тут падборам персаналу — рэкрутынгам — займаюцца няспынна, каб стварыць сапраўдную каманду прафесіяналаў. А яна не такая малая — 25 чалавек. Адкуль іх узяць? Часам беспрацоўных прысылаюць з цэнтра занятасці. Імі ўладальнікі рэстарана не вельмі задаволены. Як правіла, гэта людзі неактыўныя, да таго ж некаторыя маюць схільнасць да спіртнога. Больш спрыяльны кантынгент — студэнты ВНУ, якія вечарам прыходзяць, каб зарабіць. Але пасля заканчэння вучобы многія раз'язджаюцца. І зноў трэба не проста падабраць кадры, але і навучыць. Аксана, гаспадыня рэстарана, прызнаецца, што яна з задавальненнем прымала б ужо гатовых спецыялістаў, якіх рыхтуюць у тым ліку і гродзенскія каледжы. Але іх падрыхтоўка не адпавядае статусу ўстановы, якая прэтэндуе на высокі еўрапейскі ўзровень.

Гаспадыня заяўляе, што гатова плаціць высокія прэміяльныя, калі бачыць, што чалавек прафесійна расце, імкнецца спасцігаць новае, авалодвае замежнай мовай. Праўда, ёсць магчымасць, што такія спецыялісты самі з'едуць працаваць за мяжу, хоць не заўсёды знаходзяць там тое, што шукаюць. У любым выпадку патрэбна замена, кажа Аксана. І жартуе: пункт грамадскага харчавання адчувае голад на добрыя кадры. Сапраўды, у сферы паслуг і гандлю застаецца высокі абарот спецыялістаў, і такая тэндэнцыя захаваецца. Гэта звязана з высокім попытам на працоўную сілу ў дадзенай галіне. У асноўным гэта месцы для моладзі і жанчын.

### Інжынер і тэхнолаг у дэфіцыце

Самы працаёмкі сектар — прамысловы. Тут занята чвэрць насельніцтва рэгіёна. І, як сведчыць прагноз, гэта галіна будзе пашырацца. Сёлета менавіта ў прамысловасці будзе створана больш за ўсё працоўных месцаў — 53 % ад агульнай колькасці.

Тым не менш, як зазначылі ў абласным камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, відавочны недахоп рабочай сілы, асабліва кваліфікаваных і кампетэнтных работнікаў. **Намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Мастоўдрэў» Анатоль МАХНАЧ** расказаў, як складана было фарміраваць калектыў для новай вытворчасці. На заводзе нядаўна прайшла сур'ёзная рэканструкцыя — старую вытворчасць замянілі новымі тэхналогіямі. А вось спецыялістаў прыйшлося доўга вучыць на месцы, хоць многія прыйшлі з адпаведнай кваліфікацыяй пасля тэхналагічнага ўніверсітэта. Але з новымі тэхналогіямі, відаць, не сутыкаліся ў поўнай меры. Таму многія не спраўляюцца і сыходзяць. Вось і зараз ёсць некалькі вакансій на інжынерныя пасады. Разам з гэтым на прадпрыемстве бачаць і станоўчы працэс — з цягам часу маладыя спецыялісты больш ахвотна застаюцца працаваць менавіта на новай, сучаснай вытворчасці. Сёлета відавочная тэндэнцыя стварэння працоўных месцаў менавіта для кваліфікаваных спецыялістаў, а колькасць некваліфікаваных будзе змяншацца.

### Інвестары на рынку працы

Амаль палову новых працоўных месцаў забяспечваюць буйныя інвестпраекты. Як паведамілі ў абласным упраўленні эканомікі, у Гродзенскай вобласці іх рэалізавана каля дзясятка. Гэта не толькі дае значны эканамічны эфект, але і стабілізуе рынак працы. Дзякуючы новым прадпрыемствам у рэгіёне за мінулы год створана больш за 2000 працоўных месцаў. Адным з найбуйнейшых праектаў з'яўляецца будаўніцтва АЭС у Астраўцы, дзе задзейнічана 218 чалавек. Яшчэ 170 працоўных месцаў забяспечыла кампанія «Арвібелагра», якая рэалізуе ў Лідскім раёне праект па стварэнні інтэграванага комплексу па прамысловай вытворчасці мяса індычкі.

Амаль 100 новых працоўных месцаў створана на Гродзенскім заводзе па ўтылізацыі і механічнай сарціроўцы адходаў. Гэта прадпрыемства, дзе працуюць пераважна мужчыны, і напачатку кадравы патэнцыял вымушаў жадаць лепшага, паведамілі на заводзе. Але добры заробак, механізаваная праца дазволілі сфарміраваць трывалы калектыў. Зараз прадпрыемства працуе на поўную магутнасць.

Адзін з прыярытэтаў вобласці — развіццё дрэваапрацоўкі. Гэта абумоўлена багаццем сыравіннай базай рэгіёна, дзе лес займае каля 40 % плошчы. Таму і ў праграме развіцця Гродзенскай вобласці на 2016—2020 гады гэты кірунак мае стратэгічнае значэнне. У мінулым годзе рэалізаваны праект аўстрыйскай кампаніі «Кронаспан» у Смаргоні па стварэнні буйнога дрэваперапрацоўчага прадпрыемства. У эканоміку рэгіёна інвеставана больш за 500 млн долараў, яшчэ 200 млн будзе ўкладзена ў 2018—2019 гадах. Плануецца стварыць яшчэ 120 працоўных месцаў, а ўсяго замежная кампанія забяспечыла працай больш за тысячу чалавек.

У гэтым годзе завершыцца яшчэ шэраг значных праектаў, якія дазволяць стварыць больш за дзве тысячы новых працоўных месцаў. У канцы года ААТ «Гродна Азот» плануе ўвесці новы цэх азотнай кіслаты. У Смаргоні пачалося тэсціраванне прадукцыі маслаэкстракцыйнага завода па перапрацоўцы насення рапсу і соі. На прадпрыемстве будзе створана 100 працоўных месцаў.

Вядзецца ўстаноўка абсталявання на фармакалагічным прадпрыемстве ў Скідзелі, якое пабудавана з удзелам індыйскага капіталу. Тут будуць выпускаць прэпараты, якія зараз завозяцца ў краіну з-за мяжы. Завод плануецца запусціць у чэрвені гэтага года. Пры выхадзе на поўную магутнасць тут будуць працаваць больш як 70 чалавек.



Рэгіёну даведзена заданне працаўладкаваць 5210 чалавек за кошт стварэння новых працоўных месцаў і новых прадпрыемстваў. У вобласці мяркуюць, што здолеюць не толькі дасягнуць гэтай планкі, але і ўзяць больш высокую вышыню.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# АБАРОНІМ ПЕРШЫЯ КВЕТКІ

**Грамадзян заклікаюць адмовіцца ад збору і набыцця першацветаў.**

У краіне расце мноства першацветаў, сярод якіх ёсць расліны, уключаныя ў Чырвоную кнігу Беларусі. Збор іх забаронены і караецца штрафнымі санкцыямі ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь (арт. 15.8 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях). Гэта, напрыклад, ветрагонка лясная, пярэсна еўрапейская, прастрэл лугавы, прастрэл раскрыты, фіялка тванітая.

Акрамя чырванакніжных відаў, сярод першацветаў ёсць віды са Спіса раслін і грыбоў, якія маюць патрэбу ў прафілактычнай ахове, — гэта недастаткова вывучаныя, або рэдкія віды, а таксама звычайныя, але якія патрабуюць асаблівай увагі па прычыне высокага глабальнага прыродаахоўнага статусу (напрыклад, уключаныя ў Чырвоныя кнігі Еўропы, што ахоўваюцца ў рамках міжнародных канвенцый). Да такіх відаў у Беларусі адносяцца цыбульныя пралескі, першацвет вясновы, пералескі высакародныя, чубатка полая.

Масавы збор першацветаў падрывае колькасць іх папуляцый і здольнасць да вегетацыі. Для многіх відаў штогадовы збор раслін з пашкоджаннем каранёвай сістэмы стаў прычынай рэзкага скарачэння былога арэала распаўсюджання.

Мінпрыроды заклікае адмовіцца ад збору і куплі першацветаў. Збіраючы і прадаючы першацветы, мы губім іх, а купляючы — заахвочваем браканьераў.

Не варта рваць рэдкія вясновыя кветкі на букеты — лепш любавацца імі ў прыродзе, захоўваючы прыгажосць для будучых пакаленняў. Адмова кожнага з нас купляць кветкі, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення, дасць ім шанц цвісці кожную вясну.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ХОЧАШ ЧАРАМШЫ? ПАСАДЗІ!

**Мінпрыроды нагадвае пра недапушчальнасць самавольнага збору гэтай расліны.**

У сувязі з наближэннем сезоннай актывізацыі незаконнага збору і продажу на рынках «чырванакніжнай» расліны чарамшы, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя нагадвае аб забароне на самавольнае адабранне і знішчэнне названай дзікай расліны і заклікае грамадзян не стымуляваць пакупкамі яго незаконны збор.

Самавольнае адабранне і знішчэнне чарамшы цягне накладанне штрафу ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь. Мінпрыроды звяртаецца да грамадзян з просьбай інфармаваць аб фактах выяўлення незаконнага збору чарамшы абласныя, раённыя і гарадскія інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Разам з тым спецыялісты міністэрства заклікаюць вырошчваць гэтую расліну самім. «Найлепшы спосаб дапамагчы прыродзе — заводзіць чарамшу самім на прысядзібных участках. Яна добра размнажаецца насеннем і расадай, непатрабавальная», — раяць у Мінпрыроды.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# ВАКОЛ ШУМУ

## Як супакоіць неўгамонных суседзяў?



**Часам спрэчкі аб шуме нагадваюць размовы пра тое, што было раней — курыца ці яйка? Яны таксама могуць доўжыцца бясконца. Парушальнікі спакою звычайна прыдумваюць сабе мільён апраўданняў: па буднях я працую да шасці, калі яшчэ рамонт рабіць, як не ў выхадныя?.. Ну так, пасядзелі трохі з сябрамі, але ж дзень нараджэння толькі раз у год... І любімае — паслухай, ну з кім не бывае...**

### «Музычнае» суправаджэнне

Сусветны жаночы дзень сёлета пачаўся ў мяне даволі нестандартна. А дзявятай раніцы мяне разбудзіла... На жаль, не серэнада пад акном і нават не трэль званка ў дзверы ад кур'ера з кветкамі. Гэта была дрыль суседзяў зверху, у якіх нечакана прачнуўся працоўны запал. Я допускаю думку, што гэта была адна з частак падарунка да 8 Сакавіка ад знаходлівага суседа сваёй жонцы. Маўляў, так, пра кветкі забыўся, затое мужчынскае слова сваё трымаю: сказаў, што павешу паліцу, і павесіў — адтэрміноўка ў тры гады нічога не вырашае. Магчыма, жонка гэты ранішні подзвіг нават ацаніла (раптам гук дрыля здаецца ёй меладычным?). Я асабіста падобнае захапленне падзяліць не змагла, бо мне замест міні-рамонту дастаўся галаўны боль.

Наогул суседзі вельмі любяць падобныя сюрпрызы: калі, напрыклад, дзеляцца з намі харством любімай песні, выкананай ужывую а трэцяй гадзіне ночы, ці паасвячаюць нас ва ўсе падрабязнасці сямейных перыпетый — і сапраўды, не адзіным жа «Нязай гаворах» здавольвацца... У адказ хочацца таксама зрабіць суседзям нешта настолькі ж прыемнае: напрыклад, арганізаваць экскурсію... у аддзяленне міліцыі — яркія ўражанні сапраўды будуць забяспечаны.

Уявіш падобнае ва ўсіх падрабязнасцях — і трохі адпускае. Усё ж такі не хочацца сеяць шматгадовую варожасць паміж жыхарамі хоць і шматкватэрнага, але агульнага дома. Тым больш што з пытаннем гучных суседзяў усё не так проста. Розніца ўсяго ў дзясятак хвілін можа сыграць адную з бакоў на руку. Давайце паспрабуем разабрацца ва ўсіх тонкасцях тэмы. Дарэчы, раім захоўваць гэтую інфармацыю пад рукой — на выпадак важных перамоў у начны час.



### Малаток у рукі — хоць з 7 раніцы

Пачнём з галоўнага. У адпаведнасці з Правіламі карыстання жылымі памяшканнямі з 23 да 7 гадзін не павінны здзяйсняцца дзеянні, якія ствараюць вібрацыю і шум. Да іх адносяцца ігра на музычных інструментах, гучная прамова і спевы, прымяненне піратэхнічных сродкаў, выкананне бытавых (рамонтных) работ, правядзенне ручных пагрузачна-разгрузачных работ, рэзкае закрыццё дзвярэй і іншыя дзеянні. Па меншай меры ў гэты час права спаць спакойна можна назваць безумоўным, прычым пазначаны прамежак часу не змяняецца ні ў будню, ні ў выхадныя дні. Але калі з правядзеннем рамонту і ігрой на музычных інструментах усё зразумела, то як быць з хатнімі жывёламі, застаецца загадкай. Хоць, магчыма, ужо з'явіўся і такі кірунак у дрэсіроўцы — пасля 23 маўчок.

А вось з рамонтам сітуацыя больш складаная. У Палажэнні аб умовах і парадку перабудовы і (або) перапланіроўкі прыведзены пэўны пералік работ, якія можна праводзіць толькі з 9 да 19 у будныя дні. Да іх адносяцца замена або перанос сістэм газазабеспячэння, цэнтральнага ацяплення, смецццевыдалення, газавыдалення; абсталяванне гідра-, пара-, цепла- і гукаізаляцыі; змены ў апорных канструкцыях; змена плошчы, колькасці жылых пакояў і падсобных памяшканняў у кватэры за кошт разборкі існуючых і (або) абсталявання новых перагародак; змена плошчы і колькасці памяшканняў у ізаляваных нежылых памяшканнях за кошт разборкі існуючых і (або) абсталявання новых перагародак; абсталяванне, павелічэнне праёмаў у не нясучых сценах і перагародках. З усяго гэтага вынікае, што прыбіваць той самы цвік або прасвідраваць сцяну з іншымі — не пералічанымі вышэй — мэтамі можна ў любыя дні, з 7 і аж да 23. Так што мой сакавіцкі сюрпрыз таксама быў цалкам у межах закона. Дзякуй яшчэ, што не ў 7 раніцы...

### «Давайце жыць дружна»

Хоць часу для «пашумець» дастаткова шмат, заўсёды знаходзяцца тыя, каму яго катэгарычна не хапае. Чым гэта пагражае? Суседзяў-«гучнагаварыцеляў» могуць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці па ч. 1 арт. 21.16 КаАП, што вядзе да накладання штрафу памерам да 30 базавых велічынь, а гэта, між іншым, 735 рублёў. Дастойная плата за няўменне стрымлівацца!

У пачатку сакавіка пракуратура горада Мінска заявіла, што гэтай тэме будзе ўдзяляцца асаблівая ўвага — для гэтага распрацаваны адзіныя падыходы, якія датычацца, у першую чаргу, збору доказаў і пошуку вінаватых. Так, цяпер супрацоўнікі міліцыі на месцы павінны высветліць усе падрабязнасці, вызначыць вінаватых, пацярпелых і сведак. Пасля апрацаваныя звесткі перадаюцца ў адміністрацыі раёнаў горада, а адтуль у арганізацыі ЖКГ. У сваю чаргу, пракурор раёна ажыццяўляе нагляд за выкананнем законнасці пры вядзенні адміністрацыйнага працэсу. Актыўная работа, звязаная з гэтай праблемай, вядзецца з мінулага года. І відавочныя вынікі ўжо ёсць: у 2016-м за парушэнне правілаў карыстання жыллём у сталіцы былі прыцягнуты да адказнасці 659 чалавек, а ў 2017 годзе — амаль удвая больш, 1035 чалавек.

Хоць жаданне, каб справядлівасць перамагла, цалкам зразумелае, усё ж большасці людзей хочацца пазбегнуць канфліктаў. Тым больш, што з суседзямі трэба ўмець дамаўляцца, бо аб малых дзецях або пажылых сваяках і іх стаўленні да шуму ў кодэксе не гаворыцца. Застаецца толькі скончыць артыкул словамі героя вядомага савецкага мульціка: «Давайце жыць дружна». А галоўнае — з павагай і разуменнем, бо менавіта гэты сэнс і ўкладаецца ў слова «па-суседску».

**Дар'я КАСКО.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 22 сакавіка 2018 года.**